Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 89 (5763) | 17 красавіка 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„25 год пеставаў тав. Ленін нашу партыю і выпеставаў яе, як самую моцную і самую загартаваную ў свеце рабочую партыю. Удары царызма і яго апрычнікаў, шаленста буржуазіі і памешчыкаў, узброеныя нападзенні Калчака і Дзенікіна, узброенае ўмяшанне Англіі і Францыі, хлусня і паклёп стовуснага буржуазнага друку,—усе гэтыя скарпіёны нязменна падалі на галаву нашай партыі на працягу чвэрці века. Але наша партыя стаяла, як уцёс, адбіваючы незлічоныя ўдары ворагаў і ведучы рабочы клас уперад, к перамове. У лютых баях выкавала наша партыя адзінства і згуртаванасць сваіх радоў. Адзінствам і згуртаванасцю дабілася яна перамогі над ворагамі рабочага класа“.

(І. СТАЛІН).

ГЕНІЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Дваццаць год назад, у красавіцкую ноч 1917 года, тысячы петраградскіх рабочых і салдат сабраліся на плошчы ля Фінляндскага вакзала, каб вітаць свайго правадыра, які вярнуўся на радзіму. На пагранічнай станцыі Белаостраў Леніна сустракалі петраградскія і сестрарэцкія большэвікі, таварыш Сталін. Прыбыўшы ў горад, які з'яўляўся калыбеллю паўстання, Ленін звярнуўся да рабочай масы з палкім заклікам да сусветнай соцыялістычнай рэволюцыі. Баявым набатам прагучалі яго словы ў сэрцах мільёнаў людзей ва ўсім свеце.

Вялікі пролетарскі пісьменнік Максім Горкі ў сваім паэмэтным творы дае такі гэтай сустрэчы.

«...— Від у яго гаспадарскі»,—гаворыць рабочы аб Леніне.

«Ён неяк урос у натоўп, знік, растаяў у ім, але натоўп стаў яшчэ больш грозным, і як-бы вырас».

Прыезд правадыра нашай партыі ўдзеяпрыў сілы рэволюцыі. Яна адразу вырасла на галаву. Гісторыя паставіла перад нашай краінай задачы незвычайнага размаху, нябачанага значэння. Наша партыя пад кіраўніцтвам Леніна паспяхова правяла рэволюцыйны карабль сярод бушуючага мора класавай барацьбы, між падводных рыфаў варожага супраціўлення.

У Леніне спалучалася гіганцкая тэаратычная глыбіня са здзіўляючай здольнасцю пранікнення ў самыя затаёныя думы і пачуцці народных мас, тытанічны творчы розум — з несакрушальнай дзейснай воляй. Увабраўшы ў сябе багаты вопыт большэвіцкай партыі і неабсяжны вопыт рабочага руху ўсіх краін, Ленін яго перапрацоўваў, узнімаючы вялікае вучэнне Маркса—Энгельса на вышэйшую ступень ва ўмовах новай эпохі. Яго востры позірк ахопліваў неабдымныя гарызонты і з бездакорнай дакладнасцю разбіраўся ў найдабнейшых падрабязнасцях быстра зменяючайся абстаноўкі.

Наскрозь прагніўшы трохсотгадовы будынак манархіі рухнуў, як картачны домік. Гады вайны падарвалі народную гаспадарку, адмаўляўся служыць транспарт, у гарадах выстройвалісь чаргі за прадуктамі харчавання, вёска асталася без прамысловых прадуктаў. Па ўзору мінулых рэволюцый плады народных афяр перш за ўсё пажала буржуазія: у асобе часовага ўрада яна стала ва ўладзе. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў рабочы клас, узброены баявым вопытам генеральнай рэпетыцыі 1905 — 1907 гг., узняў сцяг далейшага развіцця рэволюцыі. Прапоўныя масы пачалі стварэць советы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Зарадзілася двоеўладзе, яно прадвяшчала блізасць рашаючых баёў.

Эсэра - меншавікі — бесхарактэрныя палітычныя «правадыры» дробнабуржуазнай дэмакратыі — са скуры лезлі вон у нізкапаклоніцтве перад буржуазіяй. Яны спрабавалі запрэгчы масы, якія толькі што скінулі ярмо самадзяржаўя, у калымагу імперыялістычнай палітыкі часовага ўрада.

На другі дзень пасля звароту ў Расію Ленін выступіў з дакументам, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Красавіцкіх тэзісаў». Тут быў майстэрскі абагулен багацейшы вопыт рэволюцыйнай барацьбы большэвікоў і начэртан шлях барацьбы ў новых умовах, на пераваале ад буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі да соцыялістычнай.

«Своеасаблівасць бягучага моманту ў Расіі заключаецца ў пераходзе ад першага этапу рэволюцыі, даўшага ўладу буржуазіі ў сілу недастатковай свядомасці і арганізаванасці пролетарыята, — да другога як этапу, які павінен даць улады ў рукі пролетарыята і бяднейшых слаёў сялянства».

Такая была чоткая ацэнка абстаноўкі. Адсюль выцякала праграма дзеянняў, якая адкрывала шырокія перспектывы і ясныя мэты.

Ні малейшай падтрымкі часоваму ўраду і цярплівае растлумачэнне памылак масам, яшчэ ідучым за соцыял-здраднікамі. Рашучае выкрыццё імперыялістычнага характару вайны і ўпартая барацьба за кожнага рабочага, селяніна, салдата, ашуканага буржуазіяй. Братанне на фронце і настойлівая прапаганда сярод «добрасумленных абаронцаў». Не буржуазная парламенцкая рэспубліка, а дыяржава новага тыпу — рэспубліка советаў. Не неадкладнае ўвядзенне соцыялізма, аб чым злосна паклёпнічалі ворагі, а абсалютна цвярозая праграма раду пераходных мерапрыемстваў, падрыхтоўваючых умовы для соцыялістычнага будаўніцтва. Неадкладнае скліканне партыйнага з'езда. Змена назвы партыі: «Мы павінны назвацца Комуністычнай Партыяй, — як называлі сябе Маркс і Энгельс». Абнаўленне Інтэрнацыянала.

У абстаноўцы крутога павароту лёсу нашай радзімы геній Леніна ярка асвятліў далейшы шлях. «Спатрэбіліся славутыя «Красавіцкія тэзісы» Леніна для таго, каб партыя магла адным узмахам выйсці на новую дарогу»,—пісаў таварыш Сталін. Тэзісы Леніна адкрылі новую старонку ў гісторыі гераічнай барацьбы нашай партыі — новую не ў сэнсе разрыву са старой тэорыяй і практыкай большэвізма, а ў сэнсе вычарпальнай праграмы дзеянняў у зменіўшайся гістарычнай абстаноўцы.

Ад буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі накіравацца на ўсіх парах да рэволюцыі соцыялістычнай — гэту мэту нашай партыі Ленін абвясціў адкрыта перад усім светам. Звярыным воем сустрэў ленінскія тэзісы варожы лагер. Затое з усеперамагаючай верай і надзеяй яны былі прыняты ў рабочых кварталах.

Большэвіцкая партыя, вышеставаная Леніным, была падрыхтавана да прыняцця ленінскай праграмы дзеянняў усім мінулым сваёй барацьбы супроць апартунізма, усім сваім практычным вопытам і тэаратычным узбраеннем. Яшчэ ў 1905 годзе Ленін распрацаваў план перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў соцыялістычную.

Калі заграхаталі гарматы па ўсёй Еўропе, большэвікі, узброеныя ленінскім вучэннем аб імперыялізме, выкрылі імперыялістычны характар сусветнай вайны і высунулі лозунг яе ператварэння ў вайну грамадзянскую. У рэволюцыйны 1917 год наша партыя ўступіла, валодаючы ленінскім вучэннем аб магчымасці перамогі соцыялізма ў адной асобна ўзятай краіне.

Пры першых грукатах рэволюцыйнага грому бліжэйшы вучань і верны саратнік Леніна таварыш Сталін спяшаецца з далёкай сібірскай ссылкі ў Петраград. Кіруючы бюро ПК і «Правдой», ён паслядоўна праводзіць палітыку далейшага развіцця і паглыблення рэволюцыі. З ленінскай цвёрдасцю і непрымірымасцю дае ён рашучы адпор гнілым меншавіцкім спробам Каменева і інш. прадаць карэнныя інтарэсы рабочага класа за чачавічную пахлёбку буржуазнай дэмакратыі. Партыя адназушна асудзіла гэтых адшчапенцаў, выступаўшых супроць барацьбы за соцыялістычную рэволюцыю. Яна рашуча выкрыла Пятакова, які рад галоў змагаўся супроць Леніна, выступаў у Кіеве супроць «Красавіцкіх тэзісаў», сеяў меншавіцка-трацкісцкае нявер'е ў магчымасць перамогі соцыялізма ў нашай краіне. Яна нястомна выкрывала Троцкага, які туляўся ў гэты час дзесьці на задворках меншавізма.

...Пераможная соцыялістычная рэволюцыя, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, за прайшоўшыя 20 год пераўтварыла нашу краіну. Магутная соцыялістычная дзяржава, падобна непрыступнаму ўцёсу, высіцца сярод мора імперыялістычных супярэчнасцей і класавай эксплуатацыі. Наша краіна, адроджаная да новага жыцця, стаў шая прыцягальным магнітам для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва, прадстаўляе велічны помнік ленінскаму генію, паказаўшаму сёй шлях да зяючых вяршынь комунізма.

(Перадавы артыкул «Правды» ад 16 красавіка).

В. І. Ленін ля Фінляндскага вакзала ў 1917 годзе.

ЗЛАМАЦЬ ШКОДНЫЯ НАСТРОІ, РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ, ВЫСОКАЯКАСНУЮ СЯЎБУ

НА ПАВАДУ Ў АДСТАЛЫХ АГРАНОМАЎ

Калгас «Чырвонаармеец», Папярнянскага сельсовета лічыцца адным з перадавых у Менскім раёне. Па ім раённыя арганізацыі раўняюць астатнія калгасы.

Здавалася-б, што тут веснавая сяўба павінна быць разгорнута сапраўды па-большэвіцку, як гэта належыць перадавому. Аднак, у гэтым калгасе не спяшаюцца. У сёлетнюю вясну траба засеяць 133 гектары зернавых, а засеяна толькі... 3 гектары. Падрыхтоўка глебы праходзіць марудна, хаця цягавая сіла моцная.

Чаму калгас зацягвае сяўбу? Старшыня калгаса Дрэй тлумачыць тым, што аграном першай Менскай МТС Крываносаў забараніў разгортваць масавую сяўбу. У калгасе апасаюцца ранішніх замаразкаў і пахаладанняў, распяваюць тэрміны сяўбы зярна да першага мая. Машынатрактарная станцыя па дагавору павінна засеяць радковымі сеялкамі 42 гектары. Сеялкі-ж у калгас яшчэ не прыслалі.

У Папярнянскім сельсовеце (старшыня Муца) яшчэ не адзін калгас не разгарнуў масавай сяўбы. Усюды чакаюць яшчэ цяплейшага надвор'я. У калгасе «Адраджэнне» падрыхтаваная пад пасеў глеба вельмі прасохла. За сяўбу-ж фактычна не прыймаліся.

Такое-ж становішча і ў калгасах Астрашынка-Гарадзецкага, Калазінчанскага, Сеніцкага і іншых сельсоветаў. Старшыні гэтых сельсоветаў тт. Машок, Шырко і Маслыка толькі займаюцца размовамі аб замаразках, а арганізаваць сяўбу не думаюць. Калгас імя Молатава, Астрашынка-Гарадзецкага сельсовета (старшыня калгаса Скавінскі), яшчэ не засынаў насенне аўса. У калгасе «Большэвік», Калазінчанскага сельсовета, на работу выходзяць позна, глебу не рыхтуюць і нічога не сеюць.

Аналагічныя факты можна прывесці з многіх калгасаў. У Менскім раёне сяўба недапушчальна запягваецца. Усюды знаходзяць рад аб'ектыўных прычын, каб толькі адцягнуць сяўбу. У Строчыцкім сельсовеце (старшыня тав. Бабурка, парторг т. Сарокін), Падгайскім (старшыня т. Драздовіч, парторг т. Сазонаў), Гатаўскім (старшыня т. Шакура, парторг т. Хількевіч), Крупіцкім (старшыня т. Жаромскі) да сяўбы не прыступіў ні адзін калгас. У раёне толькі лічаныя калгасы засеялі адзінкі гектар. На 10 красавіка па ўсяму раёну засеяна... 7 гектараў зернавых. Становішча з сяўбой у апошнюю пяцідзёнку асабліва не змянілася.

У раённым зямельным аддзеле і машынатрактарнай станцыі пануюць шкодныя настроі, якія вядуць да зрыву спісных тэрмінаў сяўбы. Агрономы сядзяць у канцылярыях і чакаюць большага пацяплення. Загалчык райземаддзела Кляўко адраўваўся ад калгасаў, не кіруе сяўбой. Большэвіцкая МТС (дырэктар т. Смірноў Г. і намеснік па палітчасці т. Улазаў) і першая Менская МТС (дырэктар т. Смірноў і намеснік па палітчасці т. Валошын) таксама спасылаюцца на мокрую глебу, не разгортваюць палявых работ.

Райком партыі (сакратар тав. Кіштымаў) і райвыканком (старшыня т. Жарын) не зламалі шкодных настрояў асобных старшынь калгасаў і сельсоветаў, парторгаў, работнікаў райземаддзела і МТС, якія затрымліваюць сяўбу і чакаюць пакуль стане зусім цёпла. Больш таго, райком і райвыканком не сказалі свайго слова, што трэба разгарнуць масавую сяўбу і, як відаць, знаходзяцца ў палоне разважанняў аб пацяпленні. 13 красавіка прэзідыум РВК і бюро РК КП(б)Б у сваёй пастанове абавязалі разгарнуць сяўбу чамусьці толькі ў чатырох сельсоветах — Строчыцкім, Падгайскім, Гатаўскім і Крупіцкім. А як быць у астатніх, прэзідыум РВК і бюро РК аб гэтым не сказалі ні слова.

Менскія раённыя арганізацыі яшчэ ў захапленні мінулагоднімі поспехамі і веснавую сяўбу ў 1937 г. пусцілі на самацёк. Вось чаму ў калгасах не разгарнулася сяўба, пануюць разважанні аб лепшым надвор'і і пацяпленні.

А. ЛОСЬ.

Чаму трактарысты пакінулі работу

Веснавая сяўба засцігла Бягомльскую МТС знянацку. 10 трактарных брыгад толькі 4 дні таму назад выехалі ў калгасы. Дзве астатнія брыгады знаходзяцца яшчэ на сядзібе МТС.

Справа ў тым, што 10 трактарыстаў пакінулі работу. Дырэкцыя МТС толькі зараз агледзілася, што нехапае людзей.

Чаму трактарысты пакінулі работу?

Гэта—вынік злачынных, бяздушных адносін да сваіх кадраў з боку дырэктара МТС Мандрыка. Гэты дырэктар-самадур незаконна накладае штрафы, адміністрыруе. У адным загадзе Мандрык аштрафаваў 60 трактарыстаў на суму 7.775 рублёў.

Штрафная палітыка Мандрыка адбілася і на рамонце трактароў. Яшчэ і зараз не адрамантаваны два трактары. У першыя дні работы трактары выбываюць са строю. Дырэктар МТС Мандрык і старшы механік Лазаравіч не прынялі ніякіх мер, каб арганізаваць работу трактарнага парка.

Становішча ў Бягомльскай МТС яўна пагражаючае.

П. ШУРАЎ.

Забылі пра аднаасобніка

У Буда-Кашалёўскім раёне налічваецца больш тысячы аднаасобных гаспадарак, але яны раённымі арганізацыямі забыты.

Кожны дзень габінет загалчыка райземаддзела тав. Лагерава перапоўнен. Аднаасобнікі прыходзяць са скаргамі, просяць адвесці ім зямлю для сяўбы, але толькі і чуюць адказы:

— Ідзіце ў сельсовет.

Губіцкі сельсовет (старшыня Атропчанка) замест дапамогі аднаасобнікам засеяць зямлю, заняўся адабраннем у іх маёмасці. У сельсовеце каля 100 аднаасобных гаспадарак, але яны пакуль што не ведаюць, дзе сеяць.

У Буда-Кашалёўскім сельсовеце 87 аднаасобных гаспадарак, але да большасці з іх не даведзены планы сяўбы, многім не ўказана зямля. Такое становішча і ў Патапаўскім сельсовеце, дзе аднаасобнікі па сённяшні дзень не ведаюць, дзе ім сеяць.

Старшыня РВК тав. Шумейка лічыць для сябе мусіць нізкім займацца з аднаасобнікамі, якія не пасеялі яшчэ ні аднаго гектара.

Аднаасобнікі кожны дзень абіваюць парогі і Перахоўскага РВК. У раёне 1060 гаспадарак, але тут абмежаваліся толькі, тым, што давялі план сяўбы. Дзе сеяць, ні адзін аднаасобнік не ведае.

Д. ПАЎЛАЎ.

Нормы на ворыве перавыконваюцца

ГРЭСК. У Палікараўскім сельсовеце разгарнуліся палявыя работы. Калгас «Чырвоны гай» падрыхтаваў для сяўбы 42,5 гектараў глебы, пракультывіраваў 32 гектары і засеяў 7,5 гектараў яравым жытам. Прыклады высокай прадукцыйнасці працы паказваюць калгаснікі Чавеліч Сымон і Зубовіч Палікар. Яны кожны дзень узорваюць па 0,85 — 0,90 гектара, замест нормы 0,40 гектара. Першае месца па падрыхтоўцы глебы займае брыгада Сцепановіча.

Арганізавана праходзяць палявыя работы ў калгасе «Случ». Тут узарана 65 гектараў глебы і засеяна 10 гектараў яравой пшаніцай і 4 гектары яравым жытам. Высокія нормы выпрацоўкі даюць калгаснікі Савіцкі В., Цвірко А. С., Цвірко А. З. Яны замест 0,50 гектара ўзорваюць па 0,75 — 0,90 гектара.

ЯЛЬНІЦКІ Алесь.

У НАРКАМЗЕМЕ ПА-РАНЕЙШАМУ ЦІХА

Чытачам «Звязды» вядома, што Кагановіцкі райком горада Менска адмяніў справаздачна-выбарчы сход у партарганізацыі Наркамзема.

Апэльваючы правядзенне справаздачна-выбарчага сходу, райком адзначыў, што сход «праходзіў на нізкім палітычным узроўні, без належнай крытыкі і самакрытыкі буйнейшых недахопаў партарганізацыі Наркамзема, у выніку чаго не былі ўскрыты меўшыя месца ў Наркамземе факты засмечанасці класава-варожымі элементамі, факты шкодніцкіх спраў, факты падхалімства, сямейственасці і запіску самакрытыкі».

Кагановіцкі райком звярнуў увагу комуністаў партарганізацыі Наркамзема БССР на неабходнасць «ускрыць да канца дапушчаныя буйнейшыя палітычныя промахі, якія далі магчымасць чужым элементам пралезці ў апарат Наркамзема і праводзіць сваю подлую шкодніцкую работу».

15 красавіка пачаўся новы справаздачна-выбарчы сход. Ужо выступіла 14 комуністаў. Выступілі начальнікі кіраўніцтваў тт. Фрыдман, Пасманік, Сокалаў, аграном Беркоўскі. Выступіў і нарком земляробства тав. Бенек. Усе гэтыя выступленні паказваюць, што палярэзванні райкома не пайшлі на карысць. Справкі па-ранейшаму ідуць на нізкім узроўні. Сход хутчэй падобен на вытворчую нараду, чымся на партыйны сход, які сабраўся пасля такога сур'ёзнага папярэджання з боку раённага камітэта партыі.

Ці згодны комуністы Наркамзема з тым, што на мінулым партыйным сходзе не былі да канца ўскрыты дапушчаныя Наркамземам буйнейшыя палітычныя промахі? Ці згодны комуністы Наркамзема з тым, што промахі ў рабоце партыйнай арганізацыі далі магчымасць чужым элементам пралезці ў апарат Наркамзема і праводзіць сваю подлую шкодніцкую работу? Ці згодны комуністы Наркамзема з тым, што ў партарганізацыі не выкарчавана яшчэ глыбока ўкараніўшаяся падхалімства? Ці згодны, нарэшце, комуністы з тым, што ў апараце Наркамзема мела месца сямейственасць і запіск самакрытыкі?

Калі згодны комуністы Наркамзема з усім гэтым, то чаму-ж яны маўчаць? Пара членам партыйнай арганізацыі Наркамзема рашуча ўскрыць прычыны ўсім ужо вядомых прарываў і промахаў. Пара ўжо комуністам Наркамзема агнём большэвіцкай самакрытыкі ўскрыць буйнейшыя палітычныя прарывы і ў прыватнасці ўскрыць прычыны, якія прывялі да глыбокага прарыву ў падрыхтоўцы веснавой пасеўнай кампаніі.

48 МЕСЯЦАЎ У ФАШЫСЦКІМ ЗАСЦЕНКУ

Нястомнаму змагару Эрнсту Тэльману 51 год

Эрнсту Тэльману — правадыру германскай компартыі, які пакутуе ў фашысцкім засценку, — 16 красавіка, споўнілася 51 год.

Міжнародны пролетарыят у дзень нараджэння Эрнста Тэльмана ў яго асобе вітае лепшага прадстаўніка германскага народу, народу, стварыўшага велізарныя матэрыяльныя каштоўнасці і высокую культуру Германіі і цяпер закованага ў ланцугі і зняволенага фашысцкімі канібаламі. Ён вітае палкага барацьбіта супроць вайны і фашызма, за інтэрнацыянальную салідарнасць працоўных.

35 год свайго жыцця Тэльман аддаў барацьбе за вызваленне рабочага класа Германіі. Верны баец комуністычнай партыі, адданы вучань Леніна і Сталіна, ён мужна змагаўся за чыстату ленінскай лініі за згуртаванасць германскага рабочага класа пад сцягам марксізма-ленінізма. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам выраслі тыя гераічныя кадры, якія не адступілі перад лютым тэрорам фашысцкіх канібалаў, якія да самай смэрці пад сякерай ката захавалі вернасць справе соцыялізма.

4 гады назад фашысцкая рэакцыя адняла Тэльмана ў германскага рабочага класа. Больш 4-х год ён пакутуе ў страшэнных фашысцкіх засценках. Аднак ніякія пакуты, ніякія катаванні не зламілі

яго рэволюцыйную мужнасць, яго сталёвую волю.

Фашысты баяцца суда над Тэльманам, яны баяцца паўтарэння лейпцыгскага працэса, яны са дня на дзень, з года на год адкладваюць суд.

4 гады змагаюцца антыфашысты ўсяго свету за вызваленне Тэльмана. Гэта барацьба стала справай гонару ўсяго міжнароднага рабочага класа, усіх чэсных абаронцаў свабоды, культуры і цывілізацыі. Барацьба за вызваленне Тэльмана — гэта барацьба за мір, за перамогу над фашызмам, за свабодную Германію.

***

СТАКГОЛЬМ (сталіца Швецыі), 16 красавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамлення рабочага друку скандынаўскіх краін, Эрнсту Тэльману, які пакутуе ў фашысцкіх засценках, пасланa шмат пісем з прывітаннем яго з днём нараджэння.

У галоўных гарадах скандынаўскіх краін адбываюцца сходы ў гонар Тэльмана. 17 красавіка ў Капенгагене (Данія) адбудзецца мітынг, на якім вядомы дацкі пісьменнік Андэрсен Нексэ выступіць з дакладам аб Тэльмане.

Нарвежская газета «Арбейдэр бладэт» прысвяціла Эрнсту Тэльману вялікі артыкул, у якім піша: «Аб Тэльмане, чыё імя стала сімвалам барацьбы супроць фашызма, яшчэ раз скажуць: ён аказаўся мацнейшым за Гітлера».

ПРЫВІТАННІ ПАПКАМУ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРУ

ЛОНДАН (сталіца Англіі). 16 красавіка. (БЕЛТА). З прычыны дня нараджэння Эрнста Тэльмана (якому сёння споўнецца 51 год) яму пасланa прывітальнае пісьмо, падпісанае 25 членамі парламента, 10 вядомымі прафесарамі, 20 відомымі пісьменнікамі, урачамі, мастакамі, настаўнікамі і многімі кіруючымі дзеячамі профсаюзаў, лейбарыстаў і комуністычнай партыі Англіі. Аўтары пісьма падкрэсліваюць узрастаючае абурэнне сусветнай грамадскай думкі па поваду таго, што германскія ўлады прадаўжаюць трымаць Тэльмана ў турме без суда, і запэўняюць, што будуць прыкладзены ўсе намаганні, каб дабіцца яго вызвалення.

Орган компартыі «Дэйлі уоркер» публікуе спецыяльны артыкул Політа, прысвечаны дню нараджэння Тэльмана.

***

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 16 красавіка (БЕЛТА). Комуністычныя газеты «Руде право», «Ротэ фанэ» і «Гало» друкуюць сёння перадавыя артыкулы, прысвечаныя дню нараджэння правадыра германскага пролетарыята Эрнста Тэльмана. Газеты публікуюць таксама тэкст прывітальнай тэлеграмы, пасланай Тэльману Цэнтральным Камітэтам комуністычнай партыі Чэхаславакіі.

РАЙКОМ НЕ КІРАВАЎ АГІТАЦЫЯЙ І ПРАПАГАНДАЙ

Тры гадзіны рабіў справаздачны даклад сакратар Нараўлянскага райкома т. Казачонак на раённым партыйным сходзе. Ён гаварыў аба ўсіх галінах работы райкома, але больш за ўсё спыняўся на пытаннях гаспадарчага характару. І гэта невыпадкова. Райком не аддаваў належнай увагі ўнутрыпартыйнай, палітычна-масавай рабоце. Ён слаба кіраваў пярвічнымі парторганізацыямі, быў адарван ад іх і таму не ведаў іхняга зместу іх работы. У радзе пярвічных парторганізацый і ў самым райкоме была прытуплена большэвіцкая пільнасць, праяўлялася палітычная блізарукасць, слепата і ратазейства.

Гэтымі палітычнымі прарывамі ў рабоце райкома і ўсёй парторганізацыі карысталіся класава-варожыя элементы розднага роду, якія ціхай сапай праводзілі сваю шкодніцкую работу. Замест разгортвання глыбокай палітычна-масавай работы сярод аднаасобнікаў і калгаснікаў раённыя кіраўнікі — упаўкамзаг Марголін і загадчык райфінаддзела Булава і рад старшынь сельсоветаў сталі на шлях адміністравання і грубага скажэння совецкіх законаў.

Сігналы аб грубых беззаконнях у раёне, узначальваемыя членам бюро райкома Марголіным, неаднаразова паступалі да сакратара райкома партыі Казачонка і старшыні райвыканкома Аксюцэнка, але яны не звярачвалі на іх увагі.

У спрэчках па справаздачнаму дакладу былі падвергнуты рэзкай крытыцы ўсе недахопы работы райкома, прычым крытыкавалі не толькі райком у цэлым, але і кожнага члена райкома, у тым ліку і самаго сакратара, які, да рэчы, быў не зусім самакрытычным у сваім дакладзе.

Выступаючыя ў спрэчках комуністы гаварылі аб тым, што партыйная работа не стаяла ў цэнтры ўвагі райкома. Такія важнейшыя пытанні партыйнага жыцця, як правядзенне партыйных сходаў пярвічнай парторганізацыі, пытанні партыйнай прапаганды і агітацыі не з'яўляліся для райкома пытаннямі першаступеннай важнасці.

Інструктары райкома Гальчанка, Газман і Рыхачэнка ў пярвічных арганізацыях бываюць вельмі рэдка. 70 проц. свайго часу яны праседжваюць у райкоме. Штодзённай дапамогі ад інструктароў пярвічныя арганізацыі не атрымлівалі, а райком партыі гэта не турбавала.

Не «знаходзіў» райком часу і для кіраўніцтва партыйнай прапагандай. Работа партыйных школ і гурткоў не правярялася і таму райком не ведаў сапраўднага становішча партыйнай вучобы, а яно далёка не здавальняюча. Кандыдацкая школа, у якой займаюцца комуністы мястэчка Нароўлі, амаль зусім не працуе. За год змянілася 6 кіраўнікоў школы. Гурток павышанага тыпу па вывучанню гісторыі партыі таксама працуе дрэнна. Яшчэ горшае становішча з партыйнай вучобай комуністаў вёскі. Там заняткі ў партыйных школах і гуртках праводзяцца ад выпадку да выпадку.

Не цікавіўся райком і якасцю праводзімай у раёне палітагітацыі. Кіраўніцтва райкома гэтым важнейшым участкам партыйнай работы не пайшло далей фармальнага вылучэння агітатараў. Фармальна арганізаваны агітколектывы, але ні адзін з іх ні разу не збіраўся. З агітатарамі, асабліва нізавымі, ніякай работы не праводзіцца, яны прадастаўлены самі сабе. Таму якасць іх агітацыйнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў надзвычайна нізкая.

Раённы актыў, у тым ліку і члены райкома Багушкі, Асіноўскі, Аксюцэнка мала вызвучалі ў вёску для правядзення палітагітацыйнай работы.

Асноўная прычына ўсіх недахопаў партыйна-масавай работы — гэта адсутнасць у парторганізацыі крытыкі і самакрытыкі, адсутнасць праверкі ажыццяўлення работы парторганаў, парткомаў і самога райкома. Райгазета «За калектывізацыю» (рэдактар т. Русак) не ўзнімалася ў сваёй крытыцы вышэй парторгаў і сакратароў парткомаў, інструктароў-жа райкома, загадчыкаў аддзелаў і членаў райкома яна абыходзіла ў сваёй крытыцы. Таму зусім заслужана абвінавачвалі газету ў не бязвубасці.

Крытыцы было падвергнута і слабое кіраўніцтва партыйна-масавай работы з боку акруговага камітэта партыі. Сакратары акруткома Раманенка, Ананнеў, калі прыязджалі ў раён, то акрамя сакратара райкома ні з кім не звязваліся. З інструктарамі райкома, парторгамі ніколі не гутарылі і не дапамагалі ім у рабоце.

Крытыкавалі на сходзе і ЦК КП(б)Б, асабліва сельгасаддзел і аддзел друку за іх слабую сувязь з раёнам.

У спіс для абрання новага складу райкома было высунута 23 кандыдатуры. Пасля абмеркавання ў спісу для тайнага галасавання асталося толькі 12. У ліку адведзеных аказалася кандыдатура ўпаўкамзага Марголіна, які з'яўляўся членам райкома старога складу. Парторганізацыі не даверыла больш Марголіну партыйнае кіраўніцтва. Людзям, якія парушаюць совецкія законы, нельга даверыць гэтага кіраўніцтва. Пераважнай большасцю галасоў былі адведзены кандыдатуры загадчыка райфінаддзела Булавы, загадчыка райзана Галдоўскага і раду іншых.

У выніку галасавання большасцю галасоў у склад райкома было абрана толькі 6 чалавек. А трэба было выбраць 7. Сакратаром райкома сход абраў т. Казачонка.

ФРАЛОЎ.

КІРАЎНІКІ, ЯКІЯ ЗАБЫЛІ ПРА ЧЛЕНА ПАРТЫІ

Комуністы фабрыкі імя Кагановіча ў спрэчках па справаздачы парткома выкрылі буйныя недахопы работы партыйнага камітэта. Асноўны і галоўны недахоп ва ўнутрапартыйнай рабоце — гэта забыццё парткомам таго, што член партыі павінен стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй партыйнай работы. Партком у сваёй штодзённай рабоце апіраўся на нязначную групу комуністаў, а астатняя маса членаў партыі не ўцягвалася ў партыйнае жыццё.

Партыйны камітэт не ведаў і не цікавіўся тым, як жыве комуніст, як ён расце ідэйна. Ярчэйшым доказам гэтаму з'явілася выступленне на сходзе кандыдата партыі тав. Шафтана. Гэта забыты ў партыйнай арганізацыі чалавек. Пры чыстцы партыі 1933 года Шафтан быў пераведзен у кандыдаты партыі за палітычную няграматнасць. Безумоўна, за гэты час Шафтан вырас палітычна. Аб гэтым сведчыць яго чоткае палітычна пасычанае выступленне.

— Ты-ж мой выхавацель, — гаворыць Шафтан, звяртаючыся да сакратара парткома тав. Гефена. — Але ці запытаў ты хоць раз у мяне, як я вучуся, працую?

— Практыка работы нашага парткома такая: або ўсхваляюць чалавека без меры, або б'юць без пачэсці меры. А мяне не б'юць і не хваляць. Партыйныя даручэнні мне ніколі не даваліся.

Выступленне Шафтана прагучала як абвінавачванне ўсёй партыйнай арганізацыі.

Не меншай нечаканасцю для партыйнай арганізацыі з'явілася і выступленне комуністкі Альброд. Зусім нядаўна заўзятыя кіраўнікі залічылі Альброд у «пасіўныя». У сваім палітычна-завостраным выступленні Альброд рашуча крытыкавала работу парткома і дырэкцыю фабрыкі, іх адарванасць ад жыцця комуністаў і рабочага калектыва.

— Партыйны камітэт не дапамагаў комуністам ні ў вучобе, ні ў стахановскай рабоце, не дапамагаў ён і агітатарам. Агітатар Бярэзін, калі праводзіць гутарку, агітуе за совецкія законы. А сам як адміністратар часта парушае гэтыя законы і таму рабочыя не вераць у яго агітацыі.

— Калі рабочы пачынае супярэчыць няправільным дзеянням Бярэзіна, ён кідае ўлюбёныя слоўцы: «Табе не спадабаецца, ідзі ад нас!».

Хто даў права Бярэзіну так гаварыць з рабочымі? Фабрыка-ж дзяржаўная, а не Бярэзіна. Аб гэтым ён забывае.

Аб тым, што партком і дырэкцыя самаўхіліліся ад кіраўніцтва стаханаўскім рухам, што ў выніку гэтага і раду іншых агіпасцяў, якія творацца на фабрыцы ў апошні час, зменшылася колькасць стахановаў — гаварылі ў сваіх выступленнях комуністы Сухімскі, Поляк, Шулькін і інш.

Выступаючыя комуністы асабліва падкрэслівалі, што дырэктар фабрыкі Кліёрын зусім не хоча гутарыць з рабочымі, не гаворачы ўжо аб тым, што ён як член парткома не правёў ні адной палітычнай гутаркі з рабочымі. Ёсць рад фактаў, калі старыя рабочыя ў апошні час ідуць з фабрыкі.

Няправільна думаюць нашы кіраўнікі, што дапамагчы чалавеку толькі прашыма можна. Яны не разумеюць, што слова, цёплае слова старэйшага таварыша-кіраўніка ў тысячу разоў даражэй, чым грошы.

— У нас няма комуністаў, якія не маглі-б расці і не жадалі-б вучыцца і працаваць. Але ёсць у нас кіраўнікі, якія не хочуць працаваць з комуністамі. І дрэнная работа ў нашым парткоме таму, што маса комуністаў ігнаравалася.

Большасць комуністаў у сваіх выступленнях указвалі на дрэнную практыку работы партыйнага камітэта, які выклікаў да сябе комуністаў толькі для таго, каб даць паганяй.

Ні партком, ні дырэкцыя не клапоцяцца аб выпрацоўванні кадраў.

— Прафорг, майстры, начальнік цэхаў, — гаворыць у сваім выступленні Сухімскі, — мяняліся як пальчаткі. У нас такая практыка: вылучаць таварыша, ён не паспее яшчэ ўвайсці ў курс справы і яго ўжо пачынаюць біць замест дапамогі. Б'юць, знімаюць з работы, закідаюць, а потым праз некаторы час зноў вылучаюць.

— Ці можа член партыі апраўдаць сябе на рабоце, калі праз некалькі дзён пасля таго, як ён прыступіў да работы, яго пачынаюць біць?

— Так было і з комуністкай Шырко, — гаворыць у сваім выступленні Шулькін. — Вылучылі яе майстрам цэха, не дапамаглі. Шырко яшчэ не паспела добра азнаёміцца з работай, яе пачалі біць, знялі. А пасля гэтага яна хадзіла пяць дзён да Гефена і Кліёрына, каб атрымаць работу.

Дырэкцыя фабрыкі піша загады, выносіць вымовы і думае, што робіць вялікую справу. — гаворыць комуніст Сухімскі. — Далей свайго кабінета дырэктар нічога не бачыць.

Зусім зразумела, што ў такой абстаноўцы знаходзіў добрую глебу для сваёй работы класавы вораг. У сваіх выступленнях комуністы асабліва падкрэслівалі рад агіпасцей, як паломкі машын, прастоі, няправільнае выкарыстоўванне абсталявання да якіх безумоўна класавы вораг прыклаў сваю руку. Ёсць факты, калі без усякіх падстаў затрымліваюць выплату зарплаты на 2—3 дні, калі незаконна зніжаюцца расцэнкі і іншае, што, безумоўна выклікае нездавальненне ў рабочых.

Аднак, на гэтыя факты зусім не рэагаваў дырэктар фабрыкі Кліёрын, тэхнарук Зельдзіч якія адарваліся ад рабочых і не хочуць нават з імі размаўляць. І ў парткоме на працягу двух месяцаў не рэагавалі на заяву, у якой указвалася на рад агіпасцяў.

Комуністы ў сваіх выступленнях ускрылі рад агіпасцяў у рабоце парткома і дырэкцыі фабрыкі. Аднак пытанні сямейственасці, якія ёсць сярод кіруючага складу фабрыкі, поўнасцю не выкрыты. Комуністы гаварылі аб тым, што пасля таго, як з фабрыкі імя Куйбышэва прышоў да іх дырэктарам тав. Кліёрын, за ім з гэтайжа фабрыкі прышоў і Гефен, прышоў Маляўскі намеснікам дырэктара. Прышлі і з завода «Большэвік», дзе раней працавалі Кліёрын і Гефен, тт. Уцеха, Кац і інш. Факты сямейственасці і зараз да канца яшчэ не выкрыты.

Ц. ФРЫД.

«Ленская бойня 4(17) красавіка 1912 г.». Там 25 год таму назад царскія войскі расстралялі рабочых Ленскіх залатых прыскаў.
Рэпрадукцыя з фатаграфіі невядомага аўтара.

ЛЕНСКІЯ ПАДЗЕІ

25 год назад 4 (17) красавіка 1912 года ў далёкай тайзе на Ленскіх залатых прысках царскае самадзяржаўе расстраляла мірную дэманстрацыю беззбройных рабочых. Ленскі расстрэл, які выклікаў бурны пратэст і незадаволенне работых усёй Расіі, з'явіўся «результатам Сталыпінскага рэжыму «супакаення» (І. Сталін, «Да дзесяцігоддзя «Правды», зборнік «Аб пролетарскім друку», стар. 77, Партвыдавецтва, 1932 г.).

Тысячамі пакараных смерцю, сасланых на катаргу, пасаджаных у турмы лепшых сыноў рабочага класа замацоўвала царскае самадзяржаўе сваё часовае таржаство над рэвалюцыяй.

***

Выданы царом 3 чэрвеня 1907 года выбарчы закон аб выбарах у III дзяржаўную думу замацаваў палітычны блок чорнасоценных памешчыкаў з вярхамі прамыслова-гандлёвай буржуазіі. Правядзенне аграрнай сталыпінскай рэформы царскае самадзяржаўе імкнулася стварыць сабе за кошт руйнавання сялянскіх мас класавую апору ў асобе кулацтва. «Трохгоддзе 1908—1910 гадоў было эпохай разгулу чорнасоценнай контрэвалюцыі...» (Ленін, Творы, т. XV, стар. 533). Авангард пролетарыята — большэвіцкая партыя была загнана ў глыбокае падполле, рабочы друк — закрыт.

Ва ўмовах жорсткай рэакцыі праследуемая царскай охранкай большэвіцкая партыя была адзінай партыяй, якая асталася вернай лозунгам рэвалюцыі. Умацоўваючы нелегальную арганізацыю, выкарыстоўваючы малейшыя легальныя магчымасці, большэвіцкая партыя мацавала свае сувязі з масамі, рыхтавала іх да новай, неміпучай рэвалюцыі.

Партыя большэвікоў у барацьбе са злейшымі ворагамі рабочага класа — ліквідатарамі, Троцкім, адзазвістамі, прымірэнцамі, у барацьбе з эсэрамі і анархістамі згуртоўвала, загартоўвала свае рады. К пачатку рэвалюцыйнага ўздыму большэвіцкая партыя была адзінай рэвалюцыйнай масавай партыяй, якая мела глыбокія карэнні ў народзе, па заклiку якой масы ўзнімаліся на барацьбу з царскім самадзяржаўем.

***

З восені 1910 г., пасля некалькіх год прамысловай дэпрэсіі, пачынаецца ўздым прамысловасці. Пачынаецца палітычнае ажыўленне ў краіне. У сувязі са смерцю Льва Талстога ўпершыню пасля гадоў рэакцыі адбываюцца вулічныя дэманстрацыі студэнтаў, у якіх прымаюць удзел і рабочыя. На прадпрыемствах у Пецербурзе праходзяць мітынгі рабочых з пратэстам супроць кары смерцю.

Ленін у снежні 1910 г. пісаў, што скончылася паласа панавання чорнасоценнай рэакцыі. «Пролетарыят пачаў. Дэмакратычная моладзь прадаўжае. Рускі народ прачынаецца да новай барацьбы, ідзе насустрач новай рэвалюцыі» (Ленін, Тв. т. XIV, стар. 393).

У 1910 годзе ў стачках прымала ўдзел 50 тыс., а ў 1911 годзе ўжо 105 тыс. чалавек.

У студзені 1912 г. у Празе адбылася канферэнцыя большэвікоў, якая мела велізарнейшае значэнне ў гісторыі партыі Леніна—Сталіна. Значэнне Пражскай канферэнцыі з выключнай чоткасцю акрэслена ў першым томе «Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР»: «...большэвікі фактычна складалі самастойную партыю ўжо з 1905 года, а з 1912 года фармальна парвалі з меншавікамі, выгналі з партыі іх правых лідэраў і аформіліся ў асобную большэвіцкую партыю» (стар. 29—30).

Пражская канферэнцыя, выбраўшая большэвіцкі Цэнтральны Камітэт на чале з Леніным і Сталіным, намецілa канкрэтныя задачы партыі ў кіраўніцтве эканамічнай і палітычнай барацьбой рабочага класа ў перыяд пачаўшагася рэвалюцыйнага ўздыму. «...Повадам к, пераходу рэвалюцыйнага настрою мас у рэвалюцыйны ўздым мас» (Ленін, Тв., т. XV, стар. 534), іскрай, якая запаліла масы рэвалюцыйным агнём, з'явіўся ленскі расстрэл.

> **Ленскія дні з'явіліся рэзультатам Сталыпінскага рэжыму «супакаення». Маладыя члены партыі, зразумела, не зазналі і не памятаюць прыгожацей гэтага рэжыму. Што датычыць старых, то ім, мусіць, памятны праклятай памяці карныя экспедыцыі, разбойнічыя набегі на рабочыя арганізацыі, масавая порка сялян і, як прыкрыццё ўсяго гэтага, — чорнасоценна-кадэцкая дума. Снаванасць грамадскай думкі, агульная стомленасць і апатыя, нястача і роспач сярод рабочых, забітасць і запалоханасць сялян пры агульным разгуле паліцэйска-памешчыцка-капіталістычнай граі — такія характэрныя рысы Сталыпінскага «супакаення».**
>
> **Павярхоўнаму назіральніку магло здацца, што эпоха рэвалюцый канула ў вечнасць, што наступіў перыяд «канстытуцыйнага развіцця» Расіі наншталт Прусіі. Ліквідатары крычэлі аб гэтым адкрыта, прапаведуючы неабходнасць арганізацыі Сталыпінскай легальнай рабочай партыі. А некаторыя старыя «большэвікі», спачуваючы ў душы такой прапаведзі, загадзя пакідалі рады нашай партыі, Таржаство пугі і цэмры было поўнае. «Мярзотнасць запусцення» — так характарызавалася тады палітычнае жыццё Расіі.**
>
> **Ленскія дні ўварваліся ў гэтую «мярзотнасць запусцення» ураганам і адарылі для ўсіх новую карціну. Аказалася, што Сталыпінскі рэжым не так уже моцны. Дума выкліканае ў масах пагарду, а рабочы клас накапіў у сабе досыць энергіі для таго, каб рынуцца ў бой за новую рэвалюцыю. Досыць было расстрэлу рабочых у далёкай сібірскай глушы (Бадайбо), каб Расія пакрылася забастоўкамі, а піцерскі пролетарыят, вышаўшы на вуліцу, адным узмахам змёў са шляху выхвальнага міністра Макарава з яго наглым лозунгам «так было, так будзе». Гэта былі першыя ластаўкі пачынаючагася магутнага руху. «Звезда» была тады права, усклікаючы: «мы жывы, кіпіць наша алая кроў агнём непатрачаных сіл!».**
>
> **У хвалях гэтага руху і нарадзілася масавая рабочая газета «Правда».**
>
> (З артыкула І. В. СТАЛІНА «Да дзесяцігодзя «Правды», надрукаванага ў «Правде» 5 мая 1922 г.).

***

У далёкай сібірскай глушы ў 1700 вярстах ад чыгункі размешчаны Ленскія залатыя прыскі. Найбагацейшыя поклады золата яшчэ з паловы мінулага стагоддзя з'явіліся крыніцай абагачэння спачатку толькі рускіх, а потым і міжнародных драпежнікаў капітала. У 1910 годзе ўсе Ленскія прыскі знаходзіліся ў манапольным валанні акцыянернага таварыства «Лена—Гольдфільдс». Галоўнымі гаспадарамі на прысках былі англійскія капіталісты, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках 71 проц. усіх акцый гэтага таварыства. Саўладальнікамі таварыства былі рускія капіталісты. Дзяржаўны банк, міністры царскага ўрада (граф Віте, міністр Цімашоў), вялікія князі, імператрыца Марыя Фёдараўна (маці Нікалая другога). На прыкладзе Ленскіх прыскаў яркa пацвярджалася, як «...інтарэсы царызма і заходняга імперыялізма спляталіся паміж сабой і зліваліся, урашце, у адзіны клубок інтарэсаў імперыялізма» (І. Сталін, «Пытанні ленінізма», X выд., стар. 5).

Гэта пераплецценне інтарэсаў знаходзіла адбітак у той жорсткай кабале і поўкаланіяльнай эксплаатацыі, якой падвяргаліся рабочыя на Ленскіх прысках. Пападаючы ў Ленскі край, рабочы аказваўся адрэзаным ад усяго свету. Рабочы дзень на прысках цягнуўся з пяці гадзін раніцы да сямі гадзін вечара, не лічачы часу на хадзьбу на работу (некаторыя баракі знаходзіліся за 10 вёрст ад шахт). Заработная плата на рукі рабочым не выдавалася, а ў кошт яе ў месяц давалі ад 3 да 7 рублёў. Мізэрныя харчы гарнякі атрымлівалі па талонах у кошт зарплаты з прысковых крам. Увесь заработак адміністрацыя па дагавору абавязана была выдаваць восеннію. Але і гэта не выконвалася.

28 лютага 1912 года пярлівасць ленскіх рабочых вычарпалася. Забастоўка выбухнула стыхійна. Повадам паслужыла выдача з прысковай крамы нягоднага для ўжывання мяса. Цяжкі эканамічны гнёт і палітычнае бяспраўе, у якім знаходзіліся ленскія рабочыя, выклікалі магутны пратэст. Забастоўка ахапіла 423 прыскі. 6258 рабочых амаль адначасова спынілі работу. 14 сакавіка забастоўка стала ўсеагульнай.

Забаставаўшыя высунулі з свайго асяроддзя выбарных. 3 сакавіка на Надзеждзінскім прыску было створана Цэнтральнае стачачнае бюро. Сярод выбарных кіруючую ролю адыгрывалі кваліфікаваныя рабочыя, — некаторыя з іх былі ўдзельнікамі рэвалюцыі 1905 года. На працягу ўсёй стачкі Цэнтральнае стачачнае бюро карысталася неабмежаваным аўтарытэтам сярод бастуючых. Змагаючыся з меншавікамі (палітычнымі ссыльнымі), якія прабавалі сарваць стачку, Цэнтральнае стачачнае бюро на працягу ўсёй забастоўкі праводзіла ў асноўным большэвіцкую тактыку барацьбы. Рабочыя выпрацавалі патрабаванні, выдажаныя ў 22 пунктах: устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, павышэнне зарплаты на 30 проц., паляпшэнне харчавання, жылля, адмена прымусовай жаночай працы, далікатнае абыходжанне адміністрацыі і інш.

Адміністрацыя «Ленэлото» (кіраўніцтва Ленскіх залатых прыскаў) накіравала ўсе намаганні і сродкі на зрыў забастоўкі. У ход былі пушчаны правакацыя, ілжывыя абяцанні, пазбаўленне прадуктаў, высяленне ў тайгу, разлік, пагрозы, арышты. З Пецербурга паляцелі тэлеграмы, загады з патрабаваннем спыніць стачку. Міністэрства ўнутраных спраў, дэпартамент паліцыі, міністэрства гандлю і прамысловасці — усе чорныя сілы самадзяржаўя злучыліся для барацьбы супроць рабочых. Аднак гарнякі трымаліся стойка. І калі стачка пагражала зацягнуцца на лета, самы гарачы час у здабычы золата, царскі ўрад рашыў узброеным шляхам задушыць стачку і паслаў на прыскі спецыяліста па расстрэлах — жандарскага ратмістра Трэпчанка.

***

4 (17) красавіка беззбройныя рабочыя, пратэстуючы супроць незаконнага арышту выбарных, з запіскамі ў руках накіраваліся на Надзеждзінскі прыск. Па мірнай дэманстрацыі быў адкрыт агонь. У рэзультаце было забіта 270 і ранена 250 рабочых. Так зверскі распраўляўся царызм з рабочымі, ахоўваючы барышы замежных і рускіх капіталістаў.

Але ленскі расстрэл не зламаў волі рабочых, забастоўка прадаўжалася яшчэ на працягу трох месяцаў пасля расстрэлу. Рабочыя не сталі на работу. Пратэстуючы супроць царскага рэжыму, яны патрабавалі вывазу іх з прыскаў. 8909 рабочых з жонкамі і дзецьмі пакінулі Ленскі край. Толькі 50 чалавек асталася на прысках. Пакідаючы прыскі, рабочыя заўлялі: «Нам соромна раніць крывавую зямлю, дзе пакоцца нашы таварышы».

Эканамічная забастоўка на Ленскіх прысках перарасла ў палітычную дэманстрацыю супроць царызма.

***

Ленін у артыкуле «Рэвалюцыйны ўздым» так ахарактарызаваў значэнне ленскага расстрэлу. «Ленскі расстрэл... з'явіўся дакладнейшым адбіткам усяго рэжыму 3-чэрвеньскай манархіі. Зусім не барацьба за адно з правоў хоць-бы самых кардынальных, самых важных для пролетарыята, характэрная для ленскіх падзей. Характэрна для іх паўнейшая адсутнасць элементарнейшай законнасці ва ўсіх адносінах. Характэрна ўступленне правакатара, шпіёна, ахранніка, слугі цара на шлях масавых расстрэлаў без усякіх палітычных повадаў. Іменна гэта агульнае бяспраўе рускага жыцця, іменна безнадзейнасць і немагчымасць барацьбы за асобныя правы, іменна гэта непадпраўнасць царскай манархіі і ўсяго яе рэжыму выступілі з ленскіх падзей так ярка, што запалілі масы рэвалюцыйным агнём». (Ленін, Творы, т. XV, стар. 534).

Па закліку большэвіцкай партыі ўзнімаецца грозны пратэст рабочага класа супроць аднаго «з самых крывавых злачынстваў царскага самадзяржаўя».

8 красавіка большэвіцкая газета «Звезда» выйшла ў жалобнай рамцы. У стачках і дэманстрацыях пратэсту супроць ленскага расстрэлу прымала ўдзел 300 тыс. рабочых.

Таварыш Сталін, які ў чалверты раз уцёк у лютым 1912 г. з ссылкі, змясціў 15 (28) красавіка ў газеце «Звезда» артыкул «Новая полоса». У гэтым выдатным артыкуле таварыш Сталін характарызаваў магутны пратэст рабочых супроць зверскай расправы царызма на Лене. «У Піцеры і Маскве, у Рызе і Кіеве, у Саратаве і Екацерынаславе, у Одэсе і Харкаве, у Баку і Нікалаеве, — усюды, ва ўсіх канцах Расіі ўзнімаюць галаву рабочыя ў абарону сваіх загубленых на Лене таварышоў».

«Мы жывы, кіпіць наша алая кроў агнём непатрачаных сіл!».

«Няма сумнення, — заканчваў артыкул таварыш Сталін, — што падземныя сілы вызвалончага руху запрацавалі...

Прывітанне вам, першыя ластаўкі!»

Ліквідатары і трацкісты прабавалі замазаць рэвалюцыйны ўздым, выкліканы ленскім расстрэлам. Яны бачылі ў ленскіх падзеях толькі барацьбу за «свабоду каліцый». Ленін і Сталін бязлітасна выкрывалі паклёп ліквідатараў і Троцкага. «Няма нічога больш ганьбавага, — пісаў Ленін, — як ліберальная выдумка, паўтараемая следам за ліквідатарамі Троцкім... быццам «барацьба за свабоду каліцый з'яўляецца асновай як ленскай трагедыі, так і яе магутнага адгалоску ў краіне» (Ленін, Творы, т. XV, стар. 534). Ленін указваў, што за патрабаваннем «свабоды каліцый» тоіцца «самая грубая карысліваасць буржуя, самая подлая трусасць контрэвалюцыянера» (там-жа, стар. 536).

Следам за забастоўкамі, выкліканымі ленскімі падзеямі, па ўсёй краіне разгортваецца стачачны рух. 1 мая 1912 года баставала 400 тыс. рабочых. Агульная колькасць баставаўшых за ўвесь 1912 год дасягнула звыш паўтара мільёна.

Гераічная барацьба ленскіх рабочых узняла масы на рэвалюцыйную барацьбу. Адкрылася новая старонка барацьбы рабочага класа за соцыялізм.

***

У нашай краіне перамогшага соцыялізма рабочы клас, які замацаваў свае вялікія заваяванні ў Сталінскай Канстытуцыі СССР, свабодна будуе шчаслівае, радаснае жыццё.

Адзначаючы 25-гадовую гадавіну з дня крывавай расправы царызма з рабочымі на Лене, рабочы клас, усе працоўныя нашай краіны з гонарам паўтараюць словы вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, сказаныя ім у 1927 годзе ў прывітанні ленскім рабочым:

«Адважная барацьба паўшых у далёкай тайзе ад царскіх куль таварышоў не забыта перамогшым пролетарыятам. Азіраючыся на пройдзены шлях, рабочыя Саюза могуць сказаць: ні адна кропля рабочай крыві балайбіншаў не прапала дарма, бо ворагі пролетарыята атрымалі адплату, а пролетарыят ужо дабіўся сваёй перамогі над імі. Цяпер, свабодныя ад царскага і капіталістычнага гнёту, на берагах Вішмы вы маеце магчымасць здабываць золата не для абагачэння дармаедаў, а для ўмацавання магутнасці першай у свеце сваёй рабочай дзяржавы. Гонар і слава паўшым у барацьбе за перамогу рабочага класа». (Зборнік «Падзеі на Лене ў дакументах», стар. 88. Партвыдат, 1932 г.).

В. СЛУЦКАЯ

20-годдзе красавіцкіх тэзісаў В. І. Леніна



Вокладка брашуры В. І. Леніна: «Задачи пролетариата в нашей революции» — 1917 г.

З ГІСТАРЫЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

З ТЭЛЕГРАМЫ

Ваеннаму міністру.
Копія міністру старшыні.

Камандзір 31 корпуса тэлеграмай №№ 2175 і 2182 данёс Вам аб адкрытым непавіншэнні на віду ў непрыцеля пры асобна павялічваючых віну акалічнасцях 517 Батумскага і 707 Нешаўскага пяхотнага палкоў. Лічу, што выратаванне арміі патрабуе: 1) неадкладнага адпаўлення дзейнасці суда, прымянення ва ўсім аб'ёме да выдання новых законаў, — кнігі 22-й звода ваенных пастаноў; 2) хуткага правядзення следства і хуткага аддання суду вінаўных; 3) прывядзення прыгавору суда ў выкананне без усякіх змякчэнняў і выключэнняў; 4) расфармавання дывізій без усякіх, сярод якіх знайшліся палкі, якія адмовіліся выканаць свой абавязак перад радзімай і выканаць базвыя распараджэнні начальнікаў; 5) вярнуць уладу начальнікам дысцыплінарную і магчымасць быстра аддаваць вінаўных суду, бо ўсведамленне беспакаранасці глыбока пранікла ў масу салдат, і, да сораму нашага, у некаторую частку афіцэраў.

21 мая 3806. Алексееў.

З дакументаў Ваен-Гіст. Арх. аб Зах. фронце (становішча арміі).

З ТЭЛЕГРАМЫ

Ваеннаму міністру.

Генерал Гурко з Менска 14 мая тэлеграфуе: «У апошні час назіраюцца вельмі частыя выпадкі арышту па пастановах салдацкіх камітэтаў камандуючых асобнымі часцямі, якавое з'явішча тлумачыцца галоўным чынам, шкодным уплывам наступаючых на фронт укамплектаванняў, ідучых арміі з запасных палкоў унутраных акруг, якія знаходзяцца пад уплывам крайніх партый большэвікоў — наслядоўнаў Леніна і проч. Адмовіцца ад прытоку папаўнення на фронце нямыслімa, бо ў арміях значны некамплект байцоў, прыбываючыя-ж папаўненні в тылу не даязджаюць наладзіцца палкавому жыццю, ідучы ўразрэз з указаннямі ўрада. Неабходна ўсіх агітатараў партыі, якія вядуць прапаганду ўразрэз з распараджэннямі ўрада а тылавых часцей удаліць, звярнуўшы на іх увагу. Мера гэта сродкамі мясцовых улад не можа быць ажыццёўлена, чаму прашу па гэтаму пытанню залежачых распараджэнняў і Вашай садзейнасці.

«Далучаючыся цалкам да заключэння Глаўкозана, лічу настойліва неабходным прыняць, нарэшце, рашучыя меры да знішчэння пагубнага самаўпраўства салдат.

Гурко.

16 мая 1917 г. 3736. Алексееў.

З дакументаў Ваен.-Гістар. Архіва аб Зах. фронце (становішча ў арміі).

В. І. ЛЕНІН

АБ ЗАДАЧАХ ПРОЛЕТАРЫЯТА У ДАНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Прыехаўшы толькі 3 красавіка ночну ў Петраград, я мог, зразумела, толькі ад свайго імя з агаворкамі адносна недастатковай падрыхтаванасці выступіць на сходзе 4 красавіка з дакладам аб задачах рэвалюцыйнага пролетарыята.

Адзінае, што я мог зрабіць для палягчэння работы сабе і добрасумленным апанентам, было прыгатаванне пісьмовых тэзісаў. Я прачытаў іх і перадаў іх тэкст тав. Цэрэтэлі. Чытаў я іх вельмі павольна і двойчы: спачатку на сходзе большэвікоў, потым на сходзе і большэвікоў, і меншавікоў.

ТЭЗІСЫ.

Друкую гэтыя мае асабістыя тэзісы, снабжоныя толькі самымі кароткімі пасяльнымі заўвагамі, якія значна падрабязней былі развіты ў дакладзе:

1. У нашых адносінах да вайны, якая з боку Расіі і пры новым урадзе Львова і К° безумоўна астаецца грабежніцкай імперыялісцкай вайной у сілу капіталістычнага характару гэтага ўрада, недапушчальны ні малейшыя ўступкі «рэвалюцыйнаму абаронніцтву».

На рэвалюцыйную вайну, якая сапраўды апраўдвае рэвалюцыйнае абаронніцтва, свядомы пролетарыят можа даць сваю згоду толькі пры ўмове: а) пераходу ўлады ў рукі пролетарыята і далучаючыхся да яго бяднейшых частак сялянства; б) пры адмаўленні ад усіх анексій на справе, а не на словах; в) пры поўным разрыве на справе з усімі інтарэсамі капітала.

З прычыны несумненнай добрасумленнасці шырокіх слаёў масавых прадстаўнікоў рэвалюцыйнага абаронніцтва, якія прызнаюць вайну толькі па неабходнасці, а не дзеля заваёў, з прычыны іх абману буржуазіяй, трэба асабліва грунтоўна, настойліва, цярпліва растлумачваць ім іх памылку, растлумачваць непарыўную сувязь капітала з імперыялісцкай вайной, даводзіць, што кончыць вайну сапраўды дэмакратычным, не гвалтоўным, мірам нельга без звяржэння капітала.

Арганізацыя самай шырокай прапаганды гэтага погляду ў дзейнічаючай арміі.

Братанне.

2. Своеасаблівасць бягучага моманту ў Расіі заключаецца ў пераходзе ад першага этапу рэвалюцыі, даўшага ўладу буржуазіі ў сілу недастатковай свядомасці і арганізаванасці пролетарыята, — да другога яе этапу, які павінен даць уладу ў рукі пролетарыята і бяднейшых слаёў сялянства.

Гэты пераход характарызуецца, з аднаго боку, максімумам легальнасці (Расія зараз самая свабодная краіна ў свеце з усіх ваюючых краін), з другога боку, адсутнасцю гвалту над масамі і, нарэшце, даверліва-несвядомымі адносінамі іх да ўрада капіталістаў, горшых ворагаў міру і соцыялізма.

Гэта своеасаблівасць патрабуе ад нас умення прыстасавацца да асобных умоў партыйнай работы ў асяроддзі нечувана шырокіх, толькі што прачнуўшыхся к палітычнаму жыццю мас пролетарыята.

3. Ніякага падтрымання Часоваму Ураду, растлумачэнне поўнай хлуслівасці ўсіх яго абяцанняў, асабліва адносна адмаўлення ад анексій. Выкрыццё, замест недапушчальнага, сеючага ілюзіі, «патрабавання», каб гэты ўрад, урад капіталістаў, перастаў быць імперыялісцкім.

4. Прызнанне факта, што ў большасці Советаў Рабочых Дэпутатаў наша партыя ў меншасці, і пакуль у слабай меншасці, перад блокам усіх дробна-буржуазных апартуністычных, якія паддаліся ўплыву буржуазіі і праводзяць яе ўплыў на пролетарыят, элементаў ад Н.-С., С.-Р. да О. К. Чхеідзе, Цэрэтэлі і інш.), Сцеклова і інш. і інш.

Растлумачэнне масам, што С.Р.Д. ёсць адзіна магчымая форма рэвалюцыйнага ўрада і што таму нашай задачай, пакуль гэты ўрад паддаецца ўплыву буржуазіі, можа з'явіцца толькі цярпліваe, сістэматычнае, настойлівае, прыстасоўваючаяся асабліва да практычных патрэбнасцей мас, растлумачэнне памылак іх тактыкі.

Пакуль мы ў меншасці, мы вядзем работу крытыкі і высвятлення памылак, прапаведуючы ў той-жа час неабходнасць пераходу ўсёй дзяржаўнай улады к Советам Рабочых Дэпутатаў, каб масы вопытам пазбавіліся ад сваіх памылак.

5. Не парламентарная рэспубліка, — зварот да яе ад С.Р.Д. быў-бы крокам назад, — а рэспубліка Советаў Рабочых, Батрацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў па ўсёй краіне, знізу даверху. Устраненне паліцыі, арміі, чыноўніцтва *).

Плата ўсім чыноўнікам, пры выбарнасці і змяняемасці ўсіх іх у любы час, не вышэй сярэдняй платы добрага рабочага.

6. У аграрнай праграме перанясенне цэнтра цяжару на Сов. Батр. Дэпутатаў.

Канфіскацыя ўсіх памешчыцкіх земляў.

Нацыяналізацыя ўсіх земляў у краіне, распараджэнне зямлёю мясцовымі Сов. Батр. і Сялян. Дэпутатаў. Выдзяленне Советаў Дэпутатаў ад бяднейшых сялян. Стварэнне з кожнага буйнага маёнтка (ў размеры каля 100 дзес. да 300 па мясцовых і іншых умовах і па вызначэнню мясцовых устаноў) узорнай гаспадаркі пад кантролем Батр. Дэпутатаў і па грамадскі кошт.

7. Зліццё неадкладнае ўсіх банкаў краіны ў адзін агульна-нацыянальны банк і ўвядзенне кантролю над ім з боку С.Р.Д.

8. Не «ўвядзенне» соцыялізма, як наша непасрэдная задача, а пераход зараз толькі да кантролю з боку С.Р.Д. за грамадскай вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў.

9. Партыйныя задачы:

а) неадкладны з'езд партыі;

б) перамена праграмы партыі, галоўнае:

1) аб імперыялізме і імперыялісцкай вайне.

2) аб адносінах да дзяржавы і наша патрабаванне «дзяржавы-комуны» *).

3) выпраўленне адсталай праграмы-мінімум;

в) перамена назвы партыі **).

10. Абнаўленне Інтэрнацыянала.

Ініцыятыва стварэння рэвалюцыйнага Інтэрнацыянала, Інтэрнацыянала супроць соцыял-шавіністаў і супроць «цэнтра» ***).

Каб чытач зразумеў, чаму мне прышлося падкрэсліць асобна, як рэдкае выключэнне, «выпадак» добрасумленных апанентаў, запрашаю параўняць з гэтымі тэзісамі наступнае пярэчанне пана Гольдэнберга: Леніным «устаноўлен сцяг грамадзянскай вайны ў асяроддзі рэвалюцыйнай дэмакратыі» (цытавана ў «Единстве» пана Плеханава, № 5).

Ці не праўда, пэрл?

Я пішу, чытаю, разжоўваю: «з прычыны бясспрэчнай добрасумленнасці шырокіх слаёў, масавых прадстаўнікоў рэвалюцыйнага абаронніцтва... з прычыны іх абману буржуазіяй, трэба асабліва грунтоўна, настойліва, цярпліва растлумачваць ім іх памылку»...

А паны з буржуазіі, якія называюць сябе соцыял-дэмакратамі, якія не належаць ні да шырокіх слаёў, ні да масавых прадстаўнікоў абаронніцтва, з ясным ілбом перадаюць мае погляды, выкладаюць іх так: «устаноўлен (!) сцяг (!) грамадзянскай вайны» (аб ёй няма ні слова ў тэзісах, не было ні слова ў дакладзе!) «у асяроддзі (!!) рэвалюцыйнай дэмакратыі»...

Што гэта такое? Чым гэта адрозніваецца ад пагромнай агітацыі? ад «Русской Воли»?

Я пішу, чытаю, разжоўваю: «Советы Р. Д. ёсць адзіна магчымая форма рэвалюцыйнага ўрада, і таму нашай задачай можа з'явіцца толькі цярпліваe, сістэматычнае, настойлівае, якое прыстасоўваецца асабліва да практычных патрэбнасцей мас растлумачэнне памылак іх тактыкі»...

А апаненты пэўнага гатунку выкладаюць мае погляды, як заклік да «грамадзянскай вайны ў асяроддзі рэвалюцыйнай дэмакратыі»!!

Я нападаў на Ч. Урад за тое, што ён не прызначаў ні хуткага, ні наогул якога-колечы тэрміну склікання Уст. Схода, аддзелваючыся посуламі. Я даказваў, што без Советаў Р. і С. Дэп. скліканне Уст. Схода не забяспечана, поспех яго немагчым.

Мне прыпісваюць погляд, быццам я супроць хутчэйшага склікання Уст. Схода!!!

Я-б назваў гэта «брэдавымі» выражэннямі, калі-б дзесяцігоддзі палітычнай барацьбы не прывучылі мяне глядзець на добрасумленнасць апанентаў, як на рэдкае выключэнне.

Г. Плеханаў у сваёй газеце назваў маю прамову «брэдавай». Вельмі добра, пан Плеханаў! Але паглядзіце, як вы нязграбны, нялоўкі і нездагадлівы ў сваёй палеміцы. Калі я дзве гадзіны гаварыў брэдавую прамову, як-жа цярпелі «брэд» сотні слухачоў? Далей. Навошта ваша газета пэлы сталбец прысвячае выкладанню «брэда»? Някругла, зусім някругла ў вас выходзіць.

Значна лягчэй, зразумела, крычаць, лаяцца, лемантаваць, чым прабаваць расказаць, растлумачыць, успомніць, як разважалі Маркс і Энгельс у 1871, 1872, 1875 г.г. аб вопыце Парыжскай Комуны і аб тым, якая дзяржава пролетарыяту патрэбна?

Былы марксіст п. Плеханаў не жадае, напэўна, успамінаць аб марксізме.

Я цытаваў словы Розы Люксембург, назваўшай 4 жніўня 1914 г. германскую соцыял-дэмакратыю «смуродным трупам». А пп. Плеханавы, Гольдэнбергі і К° «крыўдзяцца»... за каго? — за германскіх шавіністаў, названых шавіністамі!

Заблыталіся бедныя рускія соцыял-шавіністы, соцыялісты на словах, шавіністы на справе.

«Правда» № 26, 20(7) красавіка 1917 г.

Подпіс: Н. ЛЕНІН.

(Пераклаў А. Дабравольскі).

* Г. зн. замена пастаяннай арміі ўсеагульным узбраеннем народу.

*) Г. зн. такой дзяржавы, правобраз якой дала Парыжская Комуна.

**) Замест «соцыял-дэмакратыі», афіцыяльныя правадыры якой ва ўсім свеце адрадзілі соцыялізм, перайшоўшы да буржуазіі («абаронцы» і хістаючыяся «каўцкіянцы»), трэба назвацца Комуністычнай Партыяй.

***) «Цэнтрам» называецца ў міжнароднай соцыял-дэмакратыі плынь, якая хістаецца паміж шавіністамі (= «абаронцамі») і інтэрнацыяналістамі, іменна: Каўцкі і К° у Германіі Лонгэ і К° ва Францыі, Чхеідзе і К° у Расіі, Турацкі і К° у Італіі, Макдональд і К° у Англіі і т. д.



Тытульны ліст брашуры «Материалы по пересмотру партийной программы» — 1917 г.

З ГІСТАРЫЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

З ТЭЛЕГРАМЫ

Стаўка Наштаверх Петраград праз Ваеннім генералу Гурко і старшыні Выканаўчага Камітэта Петраградскага Совета салдацкіх і рабочых дэпутатаў Чхеідзе.

Стаўку 103 ПТК-ры 1369 (5243) 97. Каз. 4/V—1917 г.

4 мая генерал Весялоўскі данёсіць па дакладу камкора аб становішчы службы і настроі асабовага складу ў палках 17 Сібірскай дывізіі: «Найбольш напружанае становішча справы ў 68 Сібірскім стрэлковым палку, дзе парадак пахіснуўся настолькі, што стралкі перасталі падначальвацца законным патрабаванням. Асаблівую вострасць гэта пытанне прыняло пасля арышту палкоўніка Касцяева. Галоўнейшае зводзіцца да наступнага:

З 29 красавіка палкі не выходзяць на заняткі, матывуючы гэта тым, што яны ўжо падрыхтаваны і што, з прычыны таго, што вайны не павінна быць, то і рыхтавацца да яе не трэба.

Патрабуюць неадкладнай выдачы пенсіі па новых акладах, гаворачы, што калі даюць афіцэрам, то і ім павінны даць. Довады аб тым, што яшчэ няма загаду і водпуску грошай, не прызнаюць.

Выказваюць недавер'е ўраду ў поўным складзе і ў прыватнасці ваеннаму міністру.

Прысягу лічаць толькі ўстараўшай формай.

Камітэты палкавы і дывізійны страцілі ўсякі аўтарытэт і некаторыя з членаў гэтых камітэтаў выходзяць з іх складу, не лічачы магчымым прадаўжаць далейшую работу.

Выказваюцца супроць уласнасці памешчыка князя Радзівіла, маркуючы высекчы лес, які належыць яму, і выказваючы гатоўнасць прыйсці на дапамогу мясцовым сялянам пабудовай з яго хат. Ужо два разы праводзіліся вобыскі ў маёнтку, маркуючы там знайсці склады мукі.

Адмаўляюцца пасіць снаражэнне, знаходзячы гэта злішнім цяжарам.

Выказваюцца супроць увядзення дысцыплінарных судоў.

Імкнуцца высветліць, чаму пры фармаванні новых часцей не былі пораўну размеркаваны ўсе сумы.

Час. наштазан Алексееў.

Архіў Гістпарта 21 д. 22 1917 г. стар. 22—23. Ваен-Гістар. Архіў. Ваен. Паліт. Адда. Штаба Галоўнакам. арм. Зап. фр. «О трениях». Арх. 152—430, л. 131а — 195.

Красавіцкія дні ў Петраградзе. Рабочая дэманстрацыя. Мал. Н. Паўлава.

Ем. ЯРАСЛАЎСКІ

АБ КРАСАВІЦКІХ ТЭЗІСАХ В. І. ЛЕНІНА

20 год таму назад 3 (16) красавіка 1917 года Ленін вярнуўся з эміграцыі, у якой вымушан быў жыць пасля паступіўшай у Расіі ў 1907 годзе рэакцыі. Гэтыя гады знаходжання Леніна ў эміграцыі былі прадцягам той баявой чіпучай рэвалюцыйнай работы, якую Ленін вёў пры ўсякіх акалічнасцях: і будучы арганізатарам пецярбургскага «Союза борьбы», і седзячы ў турэмнай камеры дома папярэдняга зняволення, і ў далёкай мінусінскай ссылцы, і ў сваіх вандраваннях паміж Жэневай, Цюрыхам, Лонданам у перыяд падрыхтоўкі і пярэдадня першай рэвалюцыі, і ў Расіі ў часе першай рэвалюцыі.

У той час, калі меншавікі — ліквідатары справа і ліквідатары злева давялі большэвіцкую партыю, Ленін і Сталін прапавалі з вернымі большэвізму таварышамі над узнаўленнем партыі, над адраджэннем яе, над яе афармленнем у самастойную палітычную арганізацыю. За два гады да вайны быў створаны Цэнтральны Камітэт, выканаўцы велізарную работу ў гэты перадвызнны перыяд новага ўздыму. Калі паміж Расіяй і другімі краінамі прапягнуліся ланцугі акопаў і дротавых загарод Леніну стала яшчэ цяжэй падтрымліваць сувязь з Расіяй, з рабочымі арганізацыямі, атрымліваць дакладную інфармацыю аб тым, што робіцца ў краіне. І тым не менш яго геніяльная празорлівасць, яго веданне Расіі, разуменне ўсёй унутранай механікі класавай барацьбы і глыбокае веданне адносін класаў і партый у Расіі дапамаглі Леніну з першых-жа дзён рэвалюцыі правільна акрэсліць лінію партыі. Яго «Письма из далека» заклікалі да другога этапа — соцыялістычнай пролетарскай рэвалюцыі. Ленін заклікаў у гэтых пісьмах рыхтаваць масы да соцыялістычнай рэвалюцыі, адукоўваць для гэтага масы, узбройваць і арганізоўваць іх.

Але яшчэ да прыезду Леніна і да з'яўлення ў «Правде» яго першага «Письма из далека» з'явіліся першыя артыкулы таварыша Сталіна, які вярнуўся з ссылкі зараз-жа пасля таго, як рэвалюцыя вызваліла яго. У першых сваіх артыкулах, змешчаных у «Правде» — «О Советах Рабочих и Солдатских Депутатов» («Правда» № 8), «О войне» («Правда» № 10), «Об условиях победы русской революции» («Правда» № 12) і «Об отмене национальных ограничений» («Правда» № 17) таварыш Сталін высоўвае цэлы рад важнейшых пытанняў рускай рэвалюцыі. І пастаноўкай гэтых пытанняў таварыш Сталін, яшчэ не маючы ў сваіх руках пісьмаў Леніна, ні тэзісаў яго, як-бы перакліканепа праз велізарныя прасторы сваімі тоеснымі мыслямі з Ленінымі.

У гэтых артыкулах таварыш Сталін ставіць пытанне аб тым, як «разгарнуць далей рэвалюцыю», як забяспечыць яе пераход да наступнага этапа; на другі дзень пасля абаронніцкага антыленінскага выступлення Каменева з артыкулам аб адносінах да вайны, таварыш Сталін у артыкуле «О войне» заклікае: «сарваць маску з імперыялістаў, выявіць у вачах мас сапраўдную падаплёку пяперашняй вайны — гэта іменна і значыць абвяргнуць сапраўдную вайну вайне, зрабіць пяперашнюю вайну немагчымай». Таварыш Сталін заклікае да «арганізацыі ўзброенай сілы пролетарыята», да аднаго з важнейшых умоў перамогі соцыялістычнай рэвалюцыі.

Прыезду Леніна чакала ўся партыя. Яна ішла да новых баёў, з усіх бакоў акружоная шматлікімі ворагамі. Створанае лютаўска-сакавіцкай рэвалюцыяй двоеўладзе немінача вяло да шматлікіх палітычных крызісаў і ставіла перад пролетарыятам задачу пакончыць з гэтым дваістым становішчам і вырваць уладу з рук капіталістычных памешчыкаў і буржуазіі. Патрэбна было таксама пакончыць з хістаннямі той часткі партыйцаў, якую дробна-буржуазны дэмакрат, капітулянт і штрэйкбрахер Каменеў цягнуў назад, стараючыся пераканаць партыю, што няма чаго і думаць аб соцыялістычнай рэвалюцыі, што неабходны прапяжны інтэрвал паміж буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй і соцыялістычнай. Уносілі блытаніну граўшыя ў лявізну Бухарын, Пятакоў, Радэк, падпявалі Каменеву Рыкаў і іншыя апартуністы таго часу.

Супроць гэтых антыленінскіх настрояў яшчэ да прыезду Владзіміра Ільіча рашуча выступаў таварыш Сталін.

Прыезд Леніна нанёс руйнуючы ўдар па ўсіх гэтых апартуністычных хістаннях, бо ягоны красавіцкія тэзісы, наброскі якіх ён складаў яшчэ будучы заграніцай і асноўныя палажэнні якіх развіты яшчэ ў яго «Письмах из далека» паслужылі праграмай баявой дзейнасці партыі на ўвесь бліжэйшы перыяд да VI з'езда партыі. Глеба для таго, каб гэтыя тэзісы былі прыняты пераважнай большасцю партыі, была падрыхтавана як усёй папярэдняй дзейнасцю большэвікоў на чале з Леніным, так і той работай, якая была выканана таварышам Сталіным да прыезду Владзіміра Ільіча.

Гэтыя тэзісы далі поўш за ўсё ясны адказ па пытанню аб адносінах да вайны. Улічваючы наяўнасць даволі яшчэ значных у той час мас працоўных, якія былі ашуканы буржуазіяй і «добрасумленна заблуджаліся» ў сваіх адносінах да вайны і таму апраўдвалі рэвалюцыйнае абаронніцтва не дзеля заваявання, а дзеля абароны ад германскага імперыялізма, Ленін паставіў перад партыяй вялікую прапагандысцкую і агітацыйную задачу: партыя павінна была настойліва растлумачваць гэтым масам іх памылку, растлумачваць непарыўную сувязь з капіталам, з імперыялістычнай вайной, даказваць, што «скончыць вайну сапраўды дэмакратычным, не гвалтоўніцкім, мірам нельга без звяржэння капітала» (Ленін, т. XX, стар. 87—88).

Партыя паказала тады, на якія цуды яна здольна ў справе пастаноўкі самай шырокай прапаганды і агітацыі. Як адзін з лідэраў высвятлення адноўкавасці інтарэсаў рабочага класа ўсіх краін Ленін прапаноўваў арганізаваць братанне ваюючых войск паміж сабой. Усе памятаюць, якую хвалю шалёнай нянавісці і злобы імперыялістаў і іх прыхвасняў — меншавікоў і эсэраў выклікала тады гэта прапанова Леніна, якія пэбры брудзу і паклёпу вылівалі ўсе буржуазныя, эсэраўскія і меншавіцкія газеты на нашу партыю, патрабуючы прапягу вайны да пераможнага канца.

Ленін паставіў чотка і ясна пытанне аб далейшым развіцці рэвалюцыі — аб другім яе этапе. Ён акрэсліў момант, як пераход «ад першага этапа рэвалюцыі, даўшага ўладу буржуазіі ў сілу недастатковай свядомасці і арганізаванасці пролетарыята,—да другога яе этапа, які павінен даць уладу ў рукі пролетарыята і бяднейшых слаёў сялянства» (там-жа, стар. 88).

Пераход гэты адбываўся ў абстаноўцы вельмі складанай, калі да палітычнага жыцця прачнуліся мільённыя масы, якія не паспелі разабрацца ў рознага роду палітычных праграмах, не ўсе яшчэ зразумелі неабходнасць гэтага пераходу, яшчэ многія сяляне, салдаты і нават частка рабочых адносіліся спачатку з даверам да буржуазнага часовага ўрада. Гэта давер'е і падтрыманне буржуазіі прапаведвалі меншавікі і эсэры. Каменеў і яго пешматлікія прыхільнікі настойвалі на неабходнасці падтрымання часовага ўрада «пастолькі паскольку». Ленін адказваў усім гэтым прыхільнікам буржуазіі: «Ніякага падтрымання Часоваму Ураду, растлумачэнне поўнай ілжывасці ўсіх яго абяцанняў, асабліва адносна адмаўлення ад анексій. Выкрыццё, замест недапушчальнага, сеючага ілюзіі, «патрабавання», каб гэты ўрад, урад капіталістаў, перастаў быць імперыялістычным» (там-жа, стар. 88).

Няма нічога дзіўнага, што буржуазія падняла супроць Леніна цкаванне. Яе падганяў страх перад новымі налыходнячымі сутычкамі, перад новай рэвалюцыяй, за якой заклікала рыхтавацца партыя большэвікоў.

Мы, большэвікі, не былі яшчэ ў той час большасцю ў советах рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Гэту большасць патрэбна было яшчэ заваяваць. Ці правільна было ў гэтых умовах даваць лозунг: «далоў згодніцкія советы»? Няправільна. І партыя такога лозунга ў гэты перыяд не высоўвала. Прызнаючы советы рабочых дэпутатаў адзінай формай рэвалюцыйнага ўрада, Ленін прапаноўваў цярпліва сістэматычна і настойліва крытыкаваць і растлумачваць масам памылкі, якія рабілі ў той час советы. Адначасова Ленін настойваў на прапагандзе неабходнасці пераходу ўсёй дзяржаўнай улады да советаў рабочых дэпутатаў, незалежна да яшчэ да ўзяцця ўлады Ленін намячаў, такім чынам, у агульных рысах будучае ўстройства совецкай дзяржавы.

Заслугоўвае ўвагі, што таварыш Сталін ў першым-жа артыкуле, які ён напісаў пасля звароту з ссылкі, указваў на тое, што поўны залог перамогі заключаецца ў тым, каб умапаваць советы, «зрабіць іх паўсюднымі, увязаць іх паміж сабой на чале з цэнтральным Советам Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, як органаў рэвалюцыйнай улады народу» («Правда» № 8, 14 (27) сакавіка 1917 г.).

Адным з важнейшых пытанняў, якое хвалявала тады не толькі шырокія сялянскія масы, але і многіх рабочых, салдат і матросаў было пытанне аб зямлі: меншавікі і эсэры дапамагалі памешчыкам, землеўласнікам адцягнуць усяляк рэвалюцыйнае вырашэнне гэтага пытання. Супроць сялян, якія прабавалі ўзяць зямлю ў памешчыкаў, у манастыроў і заворвалі гэтыя землі, часовы ўрад пасылаў карныя атрады «ўгаварваючы» сялян дачакацца Устаноўчага схода, а ў сувязі з тым, што невядома было нават, калі збярэцца Устаноўчы сход, то гэта азначала, што «на справе зямля павінна астацца неўзаранай, памешчыкі астаюцца пры зямлі, сяляне без зямлі, а Расія, а рабочыя, сяляне і салдаты без дастатковай колькасці хлеба» (І. Сталін «Земля крестьянам», «Правда» № 32, за 1917 г.).

Па пытанню аб зямлі Ленін даў у красавіцкіх тэзісах дзейсны рэвалюцыйны лозунг канфіскацыі ўсіх памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі ўсіх зямель у краіне, размеркавання зямлі мясцовымі советамі батрацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Пры гэтым неабходна адзначыць, што яшчэ да ўзяцця ўлады Ленін у красавіку 1917 года намячаў хоць-бы і ў самых агульных рысах праграму стварэння калектыўнай гаспадаркі. Ворагам большэвізма выгодна было паказваць тады справу так, быццам-бы Ленін і партыя большэві-

(Працяг гл. на 4 стар.).

Ем. ЯРАСЛАЎСКІ

АБ КРАСАВІЦКІХ ТЭЗІСАХ В. І. ЛЕНІНА

(Працяг. Пачатак гл. на 3 стар.).

коў патрабуюць неадкладнага «ўвядзення» сацыялізма. Гэта было нерэзумна. Гэта была танная сацыяльная дэмагогія. Не, Ленін не збіраўся «ўводзіць» непасрэдна сацыялізм, але Ленін патрабаваў неадкладнага правядзення **пераходных** мер, якія падрыхтоўвалі пераход да сацыялістычнай гаспадаркі. Такімі мерамі Ленін лічыў **неадкладнае зліццё ўсіх банкаў краіны ў адзін агульны нацыянальны банк і ўвядзенне кантролю над ім з боку советаў рабочых дэпутатаў і кантролю совета рабочых дэпутатаў за грамадскай вытворчасцю і размеркаваннем прадукцыі.**

Такава была эканамічная і палітычная праграма, высунутая Леніным з першых жа дзён яго прыезду ў Расію. Для таго, каб паспяхова выканаць гэту задачу Ленін лічыў неабходным мабілізаваць усе партыйныя сілы, згуртаваць іх для рашучай барацьбы за высунутыя патрабаванні. Ленін лічыў неабходным **неадкладны з'езд партыі — змену праграмы партыі і змену назвы партыі.**

Прайшло 10 год з часу V (лонданскага) з'езда партыі. Самай значнай падзеяй гэтага дзесяцігоддзя партыйнага жыцця была Пражская канферэнцыя, якая сабралася ў студзені 1912 года калі быў аднаўлен большэвіцкі Цэнтральны Камітэт і арганізацыйна аформлена самастойнае існаванне большэвіцкай партыі. На працягу дзесяці год не было з'ездаў партыі і партыйная арганізацыя ў новай абстаноўцы адчувала крайнюю патрэбу ў такім з'ездзе. Гэта новая абстаноўка і абвастрэнная барацьба з меншавікамі, якія таксама называліся сацыял-дэмакратамі, як і большэвікі, высоўвала настойліва неабходнасць змены назвы партыі. Міжнародная сацыял-дэмакратыя ў пераважнай сваёй масе адрадзіла пролетарскаму сцягу, перайшла на бок буржуазіі.

Значна ўстарэла і ранейшая праграма партыі. Яна не давала ўжо адказу на цэлы рад пытанняў, пастаўленых перад рабочым класам революцыяй. Замест старой назвы сацыял-дэмакратычнай партыі Ленін прапанаваў назваць партыю комуністычнай. Пара ўжо, гаварыў Ленін, скінуць сарочку, якая стала брудная, бо сацыял-дэмакратамі зваліся ў той час і меншавікі, парваўшыя з сацыялізмам, з рабочым класам, перайшоўшыя на бок класавага ворага.

З гэтымі партыйнымі задачамі цесна звязана была і задача **абнаўлення Інтэрнацыянала.** Не было саму ўзяць на сябе ініцыятыву ў справе «стварэння новага рэвалюцыйнага Інтэрнацыянала.—**Інтэрнацыянала супроць сацыял-шавіністаў і супроць «цэнтра», апрача партыі большэвікоў.**

З самага пачатку свайго адраджэння большэвіцкая арганізацыя ў II Інтэрнацыяле была асновай новай партыі — партыі новага Комуністычнага Інтэрнацыянала. Ашчэ напярэдадні першай рэвалюцыі партыя большэвікоў вяла лінію на разрыў, на раскол з апартуністамі, лінію на стварэнне Комуністычнага Інтэрнацыянала. Цяпер настаў час ажыццявіць гэту задачу, бо II Інтэрнацыянал быў «смярдзючым трупам» па выражэнню Розы Люксембург.

Красавіцкія тэзісы Леніна знаменуюць новы перыяд у жыцці большэвіцкай партыі. Яны далі велізарны штуршок усёй партыйнай рабоце, яны далі ясную праграму дзеяння, чоткую тактыку большэвіцкай партыі. Яны згуртавалі ўсе частыйныя арганізацыі на выкананне палітычных задач найвялікшага гістарычнага значэння. На Петраградзкай гарадской канферэнцыі, а потым на Ўсерасійскай красавіцкай канферэнцыі гэтыя тэзісы былі прыняты нашай партыяй, як баявая праграма дзеянняў. Іменна гэтыя тэзісы ў значнай ступені леглі ў аснову рашэнняў VI з'езда партыі — прадказтрычніцкага з'езда большэвікоў, які вырашаў пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна пытанні пераходу і падрыхтоўкі да сацыялістычнай пролетарскай рэвалюцыі.

Вось чаму мы гаворым сёння аб гэтых тэзісах, як аб адным з важнейшых дакументаў гісторыі нашай партыі, як аб адным з важнейшых дакументаў перыяда, калі быстра нарастал рэвалюцыйныя сілы, ішоўшыя на Кастрычніцкі штурм і перамогшыя пад сцягам Леніна ў Кастрычніку 1917 года.

ВЫСТАЎКА, ПРЫСВЕЧАНАЯ 20-ГОДДЗЮ КРАСАВІЦКІХ ТЭЗІСАЎ

ЛЕНІНГРАД, 15 красавіка. (БЕЛТА). У галоўнай чытальнай зале Публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчэдрына адкрылася выстаўка, прысвечаная 20-годдзю з дня прыезду ў Петраград В. І. Леніна і красавіцкім тэзісам.

Творы таварыша Сталіна, успаміны Н. К. Крупскай, рэпрадукцыі, газетныя артыкулы, фотакопіі з дакументаў аднаўляюць карціну звароту Леніна з эміграцыі і сустрэчу яго ў Петраградзе. Цікавы фатаграфія, на якой знят Ільіч, калі ён выходзіў з вагона на перон Фінляндскага вакзала, дзе яго вітаюць сустракаючыя рабочыя, а таксама фотаздымак, які паказвае Ільіча разам з групай таварышоў у Стакгольме, у часе праезду з Швейцарыі ў Расію.

Рэпрадукцыі з карцін «Прыезд Леніна ў Петраград», у якой паказваецца, як Уладзімір Ільіч гаворыць прамову з бранявіка, «Ленін па дарозе ў Петраград», партрэт Уладзіміра Ільіча і цэлы рад фатаграфій па-мастацку афармляюць стэнд выстаўкі.

СУД НАД ЗАБОЙЦАМІ МАСТАКА Ю. М. ПЭНА

ВІЦЕБСК, 16 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сёння ў 16 гадзін у клубе імя Клары Цэткін выязная сесія Вярхоўнага суда БССР пачала слуханнем справу аб зверскім забойстве старэйшага мастака БССР Юрыя Майсеевіча Пэна. Старшынствуе старшыня крымінальнай калегіі Вярхоўнага суда БССР тав. Абушкевіч, члены суда тт. Юргайніс і Дуброўскі. Дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівае часова выконваючы абавязкі пракурора рэспублікі т. Глезераў і яго памочнік т. Мінкін, абараняюць падсудных члены віцебскай калегіі абаронцаў тт. Хазанаў, Левітан, Сістрын і Дарашкевіч.

На лаве падсудных 9 чалавек: Файнштэйн Рувім, яго жонка Лея, іх сыны Абрам, Хаім-Шлёма і Залман, дачка Нэха, другая замужняя дачка Рыва Саламонік і яе муж Саламонік Мордух. З імі лаву падсудных падзяляе былы студэнт Беларускага КІЖ'а Оліфсон. Усім ім прад'яўлена абвінавачванне па 80 артыкулу КК БССР, а Оліфсону па 24-80 артыкулах КК БССР.

Агалошанае абвінаваўчае заключэнне яшчэ раз аднавіла памятны дзень 28 лютага, калі подлай варожай рукой сям'і Файнштэйнаў было абарвана жыццё таленавітага мастака Ю. М. Пэна.

Яшчэ ўвосень 1936 года ў сям'і Файнштэйнаў абмяркоўвалася пытанне аб заўладанні маемасцю мастака. Файнштэйн Лея не раз прапаноўвала Пэну ўзяць у жонкі сваю дачку Нэху. Атрымаўшы адмову, Лея пасылала сваіх дзяцей на кватэру да мастака, каб выведаць, дзе ён хавае свае каштоўнасці а тым, каб потым яго абрабаваць. Лея вязджала ў Ленінград да свайго сына Залмана, з якім падзялілася задуманым планам абрабавання і забойства Пэна.

15 лютага камісія Беларускага кіраўніцтва па справах мастацтваў рабіла перапіс работ Пэна ў сувязі з жаданнем мастака перадаць іх дзяржаве. Гэта акалічнасць садзейнічала паскарэнню злачынства.

28 лютага прыкладна ў 6—7 гадзін вечара Абрам і Нэха зверскі зарэзалі і абрабавалі Пэна ў яго на кватэры. Папярэдне яны наносілі яму ўдары тапаром па галаве, вымагаючы грошы і каштоўнасці. Вярнуўшыся да сябе дамоў, забойцы расказалі аб зробленым імі злачынстве сваім бацькам Файнштэйнам Рувіму і Лей, сястры Рыве і жаніху Нэхі—Оліфсону, які ў той час, як студэнт КІЖ'а, праходзіў практыку ў рэдакцыі «Віцебскі пролетарый». Пакрадзеныя грошы былі адданы Лей Файнштэйн. Пры вобыску на кватэры ў Файнштэйнаў было знойдзена 1.400 руб., якія належалі Ю. М. Пэну.

На папярэднім следстве Файнштэйны Нэха, Абрам, Рувім, Хаім-Шлёма і Саламонік Рыва ў прад'яўленым ім абвінавачванні прызналі сябе вінаватымі. Файнштэйн Лея прызнала сябе вінаватай толькі ў тым, што яна пасылала Абрама і Нэху абрабаваць Пэна, але не забіваць яго. Оліфсон, Саламонік Мордух і Файнштэйн Залман на папярэднім следстве вінаватымі сябе не прызналі.

***

Пасля агалошэння абвінаваўчага заключэння старшыня суда задае абвінавачваемым пытанне, ці прызнаюць яны сябе вінаватымі. Усе 9 падсудных адказваюць адмоўна.

Першым дапрашваецца Файнштэйн Рувім. Ён прыкідваецца «Іванам непамятаючым»: нічога не памятаю, нічога не ведаю. Адно толькі ён памятае, што Нэха і Абрам 28 лютага пайшлі да Пэна за атрыманнем быццам-бы 30 руб. — падарунка, які Пэн абяцаў даць Нэхе. Прышоўшы назад дадому, Нэха і Абрам сказалі яму, што на кватэры ў Пэна яны сустрэлі нейкага незнаёмага чалавека. Зноў усплывае старая версія аб нейкім незнаёмым чалавеку.

Абвінавачваемы ўпарта адмаўляе данае ім паказанне на папярэднім следстве, у якім ён прызнаў, што прымаў удзел у распрацоўцы плана абрабавання Пэна і ўтойванні зробленага злачынства. Аднак пасля перакрыжаваных пытанняў прадстаўнікоў абвінавачвання, падсудны прымушан прызнаць, што бачыў як Абрам і Нэха, прышоўшы 28 лютага ад Пэна дадому, разам з яго жонкай Леяй пайшлі ў другі пакой і лічылі грошы і ўжо не 30 руб., а 300. Ведае, што гэтыя грошы абрабаваны ў Пэна Абрамам і Нэхай, ведае і тое, што яны яго забілі.

— А цяпер, падсудны Файнштэйн Рувім, — задае яму пытанне тав. Мінкін, — вы сябе вінаватым прызнаеце?

Файнштэйн Рувім: так, я прызнаю сябе вінаватым.

На допыце Рувіма Файнштэйна заканчваецца першы дзень судовага пасяджэння.

Працэс выклікае вялікую зацікаўленасць сярод насельніцтва Віцебска. Зала клуба перапоўнена прапоўнымі.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ІНІЦЫЯТЫВА Ў РУКАХ РЭСПУБЛІКАНЦАЎ

Ваенныя дзеянні, якія разгарнуліся на працягу апошніх дзён на ўсіх франтах у Іспаніі, паказваюць, што ініцыятыва поўнасцю знаходзіцца ў руках рэспубліканскага камандавання.

Інтэрвенты і мяцежнікі ўскладалі вялікія надзеі на наступленне войск генерала Мола на паўночным фронце—на стадыцу краіны баскаў—Більбао. Яны разлічвалі паўтарыць там «вопыт Малагі», зчысціць усё паўночнае ўзбярэжжа ад рэспубліканскіх часцей. Але мяцежнікі жорстка пралічыліся. Яны сустрэлі ўпартае супраціўленне рэспубліканскіх войск — астурыйскіх гарнякоў і баскскіх дружынікаў. Наступленне інтэрвентаў і мяцежнікаў разбілася аб другую лінію абароны рэспубліканцаў, іх парыў выдахся. Яны панеслі велізарныя страты, прымушаны былі спыніцца і заняцца ўмацоўваннем занятых пазіцый.

Наступленне рэспубліканцаў на мадрыдскім фронце, у раёне Універсітэцкага гарадка і парка Каса дэль Кампо, канчаткова пераблытала карты ворага. 10.000 мяцежнікаў, засеўшых ва Універсітэцкім гарадку, акружаны рэспубліканскімі войскамі. Апошнія занялі важныя стратэгічныя пазіцыі ў Каса дэль Кампо. Наступленне рэспубліканцаў стварыла пагрозу разрыву паміж асобнымі групамі мяцежнікаў на лініі Мадрыдскага фронта. За 5 месяцаў асады Мадрыда мяцежнікі і інтэрвенты ператварылі занятую імі тэрыторыю ва ўмацаваны раён, стварылі сістэму акопаў, абсталяваных па апошнім слову ваеннай тэхнікі. І тым не менш рэспубліканцам усё-ж удалося выбіць праціўніка з найбольш важных яго пазіцый. Асабліва адзначылася ў гэтым наступленні рэспубліканская артылерыя.

Карэспандэнты лонданскіх газет падкрэсліваюць, што наступленнем на мадрыдскім фронце рэспубліканскае камандаванне ставіла сабе мэтай прымусіць фашыстаў знять войскі з паўночнага фронта і тым сарваць наступленне на Більбао. Гэта мэта амаль дасягнута.

Паспяховыя аткі ўрадавых войск у заходнім прадмесці Мадрыда прымусілі інтэрвентаў і мяцежнікаў знять з паўночнага фронта значную частку авіяцыі, механізаваных і стралковых часцей і перакінуць іх на мадрыдскі фронт; дагэтуль сваімі наяўнымі сіламі фашысты не маглі аднавіць становішча і вярнуць страчаныя важныя пазіцыі.

У свой час мяцежнікі перакінулі на паўночны фронт войскі з арагонскага ўчастка. Яны лічылі арагонскі ўчастак найбольш спакойным, найбольш пасіўным. 10 красавіка рэспубліканцы на гэтым фронце перайшлі ў шырокае наступленне, занялі рад пазіцый і прасоўваюцца на Сарагосу і Уэску. Наступленню спрыяла рэарганізацыя каталонскіх войск, узгодненасць іх дзеянняў з апэрацыямі на іншых участках.

Несумненна, што наступленне на арагонскім фронце акажа значны ўплыў на становішча на іншых участках тэатра ваенных дзеянняў.

У заключэнне агляду неабходна адзначыць паспяховае развіццё наступлення рэспубліканскіх войск на паўднёвым фронце, дзе ўрадавыя часці шчыльна падышлі да Фуэнта Овехуна і Пеньяроя.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, ля ўзвышшаў Харабітас і Агіла і ў раёне Французскага маста рэспубліканцы, адбіўшы начныя аткі мяцежнікаў, раніцою 14 красавіка перайшлі ў контратаку. Адначасова рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала пазіцыі мяцежнікаў. У раёне ўзвышша Агіла, у разультаце дзеянняў рэспубліканцаў, мяцежнікі былі вымушаны адступіць на другарадныя пазіцыі.

***

ЛОНДАН, 15 красавіка. (БЕЛТА). На гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда) іспанскія ўрадавыя войскі прасунуліся ў сектары Брыуэга (на поўдзень ад арагонскай дарогі) на 15 кілометраў і дасягнулі арагонскай дарогі.

АРАГОНСКІ ФРОНТ

ЛОНДАН, 15 красавіка. (БЕЛТА). Найбольш уплывовая кансерватыўная газета «Таймс» паведамляе, што мяцежнікі на арагонскім фронце былі вымушаны пакінуць важныя пазіцыі ў Сіера ід Алькубіеры, за 32 кілометры на ўсход ад Сарагосы. Дарога з Альмудэвара знаходзіцца пяпер палкам пад кантролем урадавых войск. Горад Уэска не можа атрымліваць падмацаванняў з Сарагосы.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 16 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што рэспубліканскія часці, прасоўваючыся да Фуэнтэ Овехуна, занялі ўчора Сіера Грана. Такім чынам, Фуэнтэ Овехуна, не гледзячы на адчаянае супраціўленне мяцежнікаў, поўнасцю акружана.

Планы фашысцкіх агрэсараў

МАДРЫД, 15 красавіка. (БЕЛТА). Газета «Аора» паведамляе, што ў парку Каса дэль Кампо на полі бою знойдзен труп фашысцкага капітана, як думаюць, немца. У яго паходнай сумцы былі знойдзены важныя дакументы, а таксама карта, выданая ў Германіі, якая сведчыць аб далёка ідучых планах фашысцкай Германіі. На карце размечаны шматкаляровымі фарбамі лініі, па якіх павінна адбывацца фашысцкае наступленне на ўсіх франтах. Гэтыя лініі не канчаюцца ля Піранеяў, а прадаўжаюцца на французскай тэрыторыі і праходзяць па паўднёваму ўзбярэжжу Францыі.

Карта пераслана ў Валенсію.



4 красавіка з фашысцкія бамбардыроўшчыкі скінулі вялікую колькасць бомб у жылыя дамы г. Бадалоны (вакопіцы Барселоны). НА ЗДЫМКУ: разбураныя бомбамі фашысцкай авіяцыі кватэры ў г. Бадалоне.

Антыфашысцкія мітынгі ва Францыі

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 красавіка. (БЕЛТА). У Булоні (дэпартамент Сены) 13 красавіка адбыўся мітынг, на якім прысутнічала 10 тысяч чалавек. У рэзалюцыі, прынятай на мітынгу, змяшчаецца патрабаванне роспуску фашысцкіх ліг. У заключнай частцы рэзалюцыі выражаецца салідарнасць французскіх рабочых з рэспубліканскай Іспаніяй.

14 красавіка ў Парыжы адбыўся сход членаў советаў прафсаюзаў, скліканы аб'яднаннем прафсаюзаў Парыжскага раёна. Сход рашыў арганізаваць 24 красавіка вялікую дэманстрацыю супроць дарагоўлі, за ўвядзенне рухомай шкалы зарплаты і арганізацыю грамадскіх работ. Лозунгамі дэманстрацыі будзе таксама салідарнасць з рэспубліканскай Іспаніяй і патрабаванне роспуску фашысцкіх ліг.

Забарона першамайскіх дэманстрацый у Японіі

ТОКІО (сталіца Японіі), 15 красавіка. (БЕЛТА). Такійская паліцыя, у адпаведнасці з рашэннем міністэрства ўнутраных спраў ад 13 красавіка, афіцыяльна абвясціла аб забароне першамайскай дэманстрацыі ў Токіо.

Услед за гэтым міністэрства ўнутраных спраў разаслала ўсім губернатарам інструкцыі аб забароне па ўсёй краіне якіх-небудзь святкаванняў Першага мая пад адкрытым небам.

НАПРУЖАНАЕ СТАНОВІШЧА Ў БІСКАЙСКІМ ЗАЛІВЕ

ВЫСТУПЛЕННЕ ІДЭНА У ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 15 красавіка. (БЕЛТА). Выступаючы ў часе спрэчак у палаце абшчын (парламенце) па пытанню аб блакадзе Більбао, міністр замежных спраў Англіі Ідэн заявіў, што ён толькі што атрымаў ад англійскага консула ў Більбао тэлеграму, у якой гаворыцца, что ў апошнія два тыдні там можны дзень адбываецца бамбардыроўка.

Паводле слоў Ідэна абавязкам урада было інфармаваць аб гэтых фактах англійскія гандлёвыя судны.

Далей Ідэн заявіў, што ў адкрытым моры англійскія судны маюць права на абарону і што адначасова англійскі ўрад лічыць сябе абавязаным папярэдзіць іх аб небяспеках, існуючых ля Біскайскага ўзбярэжжа. Мы не можам гарантаваць,— заявіў ён далей,—што гэтыя судны будуць у безапаснасці ў тэрытарыяльных водах каля Більбао.

Ідэн указаў, што абмеркаванне пытання аб адкліканні добраахвотнікаў будзе адноўлена на наступным пасяджэнні камітэта па неўмяшанню.

Паводле слоў міністра, галоўныя дзеянні ў іспанскіх тэрытарыяльных водах былі-б роўназначны ўмяшанню ў барацьбу.

Ідэн напомніў, што англійскі і французскі ўрады яшчэ ў жніўні мінулага года прышлі да пагаднення аб неабходнасці ўнікаць усіх ускладненняў, якія могуць нанесці шкоду міжнародным адносінам і адмовіцца ад усякага прамога ці ускоснага ўмяшання ва ўнутраныя справы Іспаніі. Палітыка, якую праводзяць апазіцыя, прывяла-б да зрыву пагаднення аб неўмяшанні.

Адказваючы на адно з пытанняў міністр заявіў, што ён атрымаў ноту іспанскага ўрада, у якой паведамляецца высадка ў Калькасе 23—25 сакавіка 10 тысяч італьянцаў. Зараз урад высвятляе гэту справу. На пытанне, ці не з'яўляецца гэты факт грубым парушэннем з боку Італіі пагаднення аб неўмяшанні, Ідэн адказаў: «Так, несумненна, калі гэта адпавядае сапраўднасці».

АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ КАНТРОЛЮ НА ІСПАНСКІХ ГРАНІЦАХ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 15 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, сёння адбылося пасяджэнне падкамісіі лонданскага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі. Пастаноўлена ўвесці ў дзеянне план кантролю на моры і на сухапутных гранiцах Іспаніі ў ноч на 20 красавіка.

Пытанне аб адкліканні добраахвотнікаў з Іспаніі, паводле слоў агенцтва, перадана ў спецыяльную камісію.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
17 красавіка Абан. № 86.
АПОШНІЯ.

Памяш. Дзярж. Яўрейск. тэатра
17 красавіка Абан. № 19.
БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
СЕВІЛЬСКІ ЦЫРУЛЬНІК

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ТОМ СОЙЕР
Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
НАЗАР СТАДОЛЯ
Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» «ВРАТАРЬ»
Дзіцячы гукавы кінатэатр
ЮНАЦТВА МАКСІМА
Гукавы кінатэатр «Спартак»
МАРЫЯНЕТКІ

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 18 КРАСАВІКА:
8.30—«Апошнія паведамленні». 10.30 — канцэрт па заяўках дзяцей. 13.30 — перадача на польскай мове. 14.20 — канцэрт для калгаснікаў. 16 — канцэрт па заўках радыёслухачоў. 17.15— перадача на ўрэйскай мове. 18.15 — міжнародны агляд. 18.30 — канцэрт. 19 — вершы В. Маякоўскага. 19.30 — разучванне песень да першамайскіх свят. 21 — опера Моцарта «Свадьба Фігаро».

СЁННЯ, 17 красавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканні клуба імя Сталіна адбудзецца ПРАЦЯГ ПАСЕДЖАННЯ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РС І ЧД.
Яўка членаў і кандыдатаў Горсовета абавязкова.
Запрашальныя білеты сапраўдны.
ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ГЭТЫМІ ДНЯМІ
па ЛЕНІНСКАЙ вул., 5
АДКРЫВАЕЦЦА
ЎЗОРНАЕ КАФЭ
У продажы
ВЫСОКАГАТУНКОВЫЯ КАНДЫТАРСКІЯ ВЫРАБЫ
ТАРТЫ, КЕКСЫ, ПІРОЖНЫЯ,
ЧАЙ, КАВА, КАКАО, МАЛАКО.
Кафэ будзе адкрыта з 8 г. раніцы да 1 г. ночы.
ДЫРЭКЦЫЯ ХЛЕБНАЙ КОНТОРЫ МЕНГОРХАРЧГАНДЛЯ.

МАНТАЖНА-БУДАЎНІЧАЯ КАНТОРА
ПРЫ ЭНЕРГАКІРАЎНІЦТВЕ НККГ БССР
„БЕЛКОМУНЭНЕРГАБУД"
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ НА ВЫКАНАННЕ НАСТУПНЫХ
ПРАЕКТНЫХ РАБОТ:
1. ПРАЕКТНЫХ ЗАДАННЯЎ, ТЭХНІЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПРАЕКТАЎ І КАШТАРЫСАЎ:
а) ДЫЗЕЛЬНЫХ, ЛАКАМАБІЛЬНЫХ, ГАЗАГЕНЕРАТАРНЫХ, ПАРАМАШЫННЫХ І ПАРАТУРБІННЫХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ АГУЛЬНАГА КАРЫСТАННЯ Ў ПОЎНЫМ АБ'ЕМЕ;
б) ЭЛЕКТРЫЧНЫХ СЯЦЕЙ І ПАДСТАНЦЫЙ КОМУНАЛЬНАГА ЗНАЧЭННЯ;
в) ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ КОМУНАЛЬНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ВЯЛІКІХ ЖЫЛЛЁВЫХ БУДЫНКАЎ.
З запросамі звяртацца па адрасу: Менск, Маскоўская, 3 (ва двары) «Белкомунэнергабуд», тэл. 25-418.

ДА ЎВАГІ ГАНДЛЮЮЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ!
НКВТ СоюзоптбакалеяСССР
УНОЎ АРГАНІЗАВАНАЯ
БЕЛАРУСКАЯ БАЗА
УСЕСАЮЗНАЙ КАНТОРЫ ПА АПТОВАМУ ГАНДЛЮ ДРОБНАЙ БАКАЛЕЯЙ
„СОЮЗОПТБАКАЛЕЯ"
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, што НА БАЗЕ ЁСЦЬ НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ
КРУХМАЛЬНЫЯ, КАФЭ-ДЫЕТЫЧНЫЯ СМАКАВЫЯ ІншАЯ БАКАЛЕЯ, ГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫ, КАНДЫТАРСКІЯ ВЫРАБЫ, ВІНА-КАНЬЯЧНЫЯ ВЫРАБЫ, СУХАФРУКТЫ, АРЭХІ, ЦЫТРУСАВЫЯ, СПЕЦЫІ імпартныя і айчынныя і іншыя тавары.
БАЗА ЗАКУПЛЯЕ У ЗАГАТОЎЧЫХ І ВЫТВОРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ наступныя ТАВАРЫ:
ГРЫБЫ СУХІЯ, САЛЁНЫЯ і МАРЫНАВАНЫЯ, ЯБЛЫКІ МОЧАНЫЯ, ЦВЯТНУЮ КАПУСТУ, ГУРКІ САЛЁНЫЯ, СЛІВЫ і ВІШНІ МАРЫНАВАНЫЯ, СУХАГАРОДНІНУ і СУХАФРУКТЫ розныя ўраджаю 1937 г., СУХІЯ КСЯЛІ, сяго штучнае ФАРФЕЛЬ, МАКАРОНЫ і інш.
ЗАПРОСЫ І ПРАПАНОВЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ: г. МЕНСК, РАКАЎСКАЯ, 2, «СОЮЗОПТБАКАЛЕЯ», ТЭЛ. № 21-132, К/К. РАХ. № 60128 У ДЗЯРЖБАНКУ.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ХІМІЯ—У БЫТ!
Да ўвагі аматараў кветкаводства, садоўніцтва і гароднічтва
ГАЛОЎХІМПРОМ
ВЫПУСЦІЎ у ПРОДАЖ расфасованых мінеральных гнаёвых сумесі
ў разважцы па 100, 500 грам і 1 кг. наступных найменаванняў:
«ПРИМУЛАТ» — для хатніх раслін.
«ЦИТРУС» — для лімона, апельсіна і мандарына.
«ФРАГАР» — для клубнікі і земляніцы.
«КЛУМБАТ» — для аднагадовых і шматгадовых кветак у грунту.
«БРАССИТ» — для гуркоў і капусты.
«ФЛОРАТ» — для дэкаратыўных кустарнікаў і газонаў.
«ФРУКТАТ» — для плаўовых дрэў і ягадных кустоў.
«АГАРОДНАЯ» — для гароднінны, корнеплодаў і бульбы.
У СКЛАДЗЕ СУМЕСІ ЗНАХОДЗЯЦЬ УСЕ АСНОЎНЫЯ СПАЖЫВНЫЯ РЭЧЫ — АЗОТ, ФОСФАР І КАЛІЯ.
ПРЫМЯНЕННЕ СУМЕСЕЙ УЗМАЦНЯЕ РОСТ І ПРАДОЎЖВАЕ ЦВІЦЕННЕ І ПАВЫШАЕ ЎРАДЖАЙ ФРУКТАЎ, ЯГАД І ГАРОДНІНЫ.
ПРОДАЖ ПРАВОДЗІЦЦА ФІЛІЯМІ АПТЭКАМІ, МАГАЗІНАМІ САВІГАРЫ І ГІГІЕНЫ І ГАНДЛЮЮЧАЙ СЕТКАЙ НАРКОМУНУТГАНДЛЯ.
ПРЫ АДСУТНАСЦІ СУМЕСІ НА МЯСЦАХ ЗВЯРТАЦЦА Ў БЕЛАРУСКУЮ КАНТОРУ ГОЛОЎХІМПРОМА: МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 85.

Друкарня газеты «Звязда». Менск, Савецкая, 83.

Уп. Галоўлітбела № К—2064. Б. К. С.